МЭТА НА «МІЛЬЁН» ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ

ЧЫРВОНКА

СЯМЕЙНАЯ ВЯЧЭРА ПА-СТУДЭНЦКУ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 СТУДЗЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 6 (29375)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

«Стаіць задача эфектыўнага выкарыстання кожнага метра тэрыторыі холдынга «Гарызонт» пад размяшчэнне новых вытворчасцяў, каб людзі былі забяспечаны работай, і гэтыя вытворчасці прыносілі карысць дзяржаве... Прадукцыя, якую сёння вырабляе холдынг, павінна быць увязана ў эканоміку і актыўна выкарыстоўвацца ў адукацыйнай сферы, медыцынскай галіне краіны. Часу ў нас няшмат, таму рашэнне па гэтым пытанні павінна быць прынята ў самы бліжэйшы час».

КАРАТКА

- Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс пачаў работу ў тэставым рэжыме.
- **Развітацца з мітрапалітам Філарэтам у Свята-Духавым кафедральным саборы можна да 18.00 14 студзеня.**
- Чырвоны Крыж абсталюе пункт абагравання каля дома начнога знаходжання ў Мінску.
- **Інфляцыя ў Беларусі ў 2020 годзе склала 7,4 %.**
- Убудаваныя ў шматпавярховікі дзіцячыя садкі з'явяцца ў Пінску і Іванаве.
- **Фестываль еўрапейскага кіно пройдзе ў Мінску з 20 да 31 студзеня.**
- «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў ва ўсе пункты Расіі, акрамя Дамадзедава, да 27 сакавіка.
- **Аб'яднаныя музыкай «Песняроў» карціны прадставілі ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва. Наведаць выставачны праект можна да 24 студзеня.**

ISSN 1990 — 763X

«Конікі» ідуць!

У палескім Давыд-Гарадку ў ноч на стары Новы год праходзіць старажытны шчадроўны абрад пад назвай «Конікі» — адзіны ва ўсёй Беларусі.

Яго выконваюць з году ў год, дзесяцігоддзямі і нават стагоддзямі. Гарадчукі ганарацца, што дзяржава будзе падтрымліваць і садзейнічаць захаванню і пашырэнню традыцыі, бо «Конікам» нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Адны з заўсёдных давыд-гарадоцкіх калядоўшчыкаў, Сяргей ТУРАВЕЦ у ролі Вершніка, і Дзядуля Мароз — ён жа Уладзімір КУЛАГА, абыходзяць знаёмыя з дзяцінства вуліцы, нясуць свята гасцінным і шчодрым месцічам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Падзея

ПРЫМНОЖЫЦЬ ЗДАБЫТКІ

У Гродне ўручаны прэміі пераможцам абласнога конкурсу імя Аляксандра Дубко

СТАР. 3

І мы там былі

«АХВОТНЫХ НАСТОЛЬКІ МНОГА, ШТО СКОНЧЫЛІСЯ БЛАНКІ»

Як прайсці тэхагляд ва ўмовах ажыятажу?

З пачатку студзеня на дыягнастычных станцыях ажыятаж! Беларусы масава паехалі праходзіць тэхагляд. Чэргі назіраюцца як у абласных цэнтрах і іншых гарадах, так і ў сталіцы. Кіроўцы праводзяць у іх па некалькі гадзін. Карэспандэнт «Звязды» адстаяла чаргу на станцыю тэхнічнай прафілактыкі, пабывала на лініі і згадала ўжо забытыя адчуванні — хваляванне, як на экзамене.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

СТАР. 4

Афіцыйна

ГУЛЬНІ БЕЗ ПАЛІТЫКІ

прапануе беларускі бок

Беларусь пацвердзіла сваю гатоўнасць да правядзення чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2021 года, паведаміў Арганізацыйны камітэт па правядзенні згаданага чэмпіянату па выніках сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея на лёдзе Рэнэ Фазелем, якая адбылася 11 студзеня.

«Рэспубліка Беларусь гатова забяспечыць у поўным аб'ёме ўвесь комплекс неабходных мерапрыемстваў, у тым ліку арганізацыйнага, супрацьэпідэмічнага характару, а таксама гарантаваць бяспеку і камфортнае знаходжанне ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату з улікам рэкамендацый МФХ», — гаворыцца ў адпаведным паведамленні, тэкст якога размешчаны на афіцыйным сайце Савета Міністраў Беларусі.

Далей у дакуменце пералічаныя гарантыі і адказы на ўзнятыя на сустрэчы з Рэнэ Фазелем пытанні.

Пры арганізацыі чэмпіянату беларускі бок будзе прытрымлівацца рэкамендацый і правілаў, якія ўстаноўлены МФХ для правядзення спаборніцтваў з улікам пандэміі COVID-19, а таксама забяспечыць доступ замежным СМІ да акрэдытацыі для асвятлення чэмпіянату і гарантуе стабільную работу сеткі Інтэрнэт.

Беларускі бок забяспечыць поўную бяспеку ўдзельнікаў і гледачоў чэмпіянату ў адпаведнасці са сваімі абавязацельствамі, як і для ўсіх іншых міжнародных спартыўных спаборніцтваў, якія праведзены і праводзяцца ў Беларусі.

«Факты выключэння беларускіх спартсменаў са зборных камандаў і адхілення ад спаборніцтваў за палітычныя погляды, якія нібыта маюць месца, з'яўляюцца беспадстаўнымі. Беларускі бок прадставіць МФХ усю неабходную фактуру, якая раней неаднаразова накіроўвалася ў МАК і іншыя міжнародныя спартыўныя структуры. Разам з тым сапраўды меліся факты затрымання і прыцягнення да адказнасці асобных спартсменаў за ўдзел у мерапрыемствах, якія парушаюць грамадскі парадак, строга ў рамках беларускага заканадаўства», — сказана ў паведамленні аргкамітэта.

«У частцы прэтэнзій, якія маюцца ў дачыненні да старшыні Федэрацыі хакея Беларусі Дзмітрыя Баскава, беларускі бок зыходзіць з прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці як базавага прававога пастулата, але ў якасці жэста добрай волі гатовы арганізаваць сустрэчу прадстаўнікоў Дысцыплінарнага камітэта МФХ з генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь для азнаямлення з вынікамі праведзеных праверачных мерапрыемстваў у рамках даследчай праверкі», — адказ на яшчэ адно пытанне, якое абмяркоўвалася на сустрэчы з кіраўніком МФХ.

Беларускі бок гатовы да дыялогу як з Латвіяй, суарганізатарам чэмпіянату, так і з любымі іншымі краінамі, па пытаннях найлепшага правядзення сумеснага чэмпіянату, а не выкарыстання яго ў якасці інструмента палітычнага ціску на краіну, падкрэсліваюць беларускія арганізатары.

«Увязка правядзення чэмпіянату са зменамі Канстытуцыі, арганізацыяй нейкага «дыялогу» і іншымі ўнутранымі пытаннямі Беларусі сама па сабе абсурдная. Але паколькі гэтая тэма ўвесь час укідваецца звонку, беларускі бок інфармуе, што рэальны працэс грамадскага дыялогу ўжо даўно (з кастрычніка 2020 года) запушчаны ў выглядзе створаных дыялогавых пляцовак ва ўсіх рэгіёнах краіны, у ходзе работы якіх ужо ўнесена каля 4,5 тысячы прапаноў грамадзян, грамадскіх арганізацый і калектываў, а таксама больш за 2 тысячы прапаноў паступіла ад грамадзян у грамадскія прыёмныя па розных аспектах развіцця дзяржавы і грамадства, і гэты працэс працягваецца, — дадае беларускі бок. — З улікам гэтых прапаноў на Усебеларускім народным сходзе, які пройдзе ў лютым 2021 года, дэлегатамі будуць выпрацоўвацца напрамкі грамадска-палітычнага развіцця краіны, уключаючы асноўныя падыходы да змены Канстытуцыі, якія пасля могуць быць прыняты толькі самім беларускім народам на рэферэндуме».

Беларускія ўлады адкрытыя да любога дыялогу са сваімі грамадзянамі, якія маюць розныя погляды як на канстытуцыйныя пытанні, так і на любыя іншыя аспекты, што датычацца будучага развіцця краіны, «але не на каленях і не ва ўмовах знешняга ціску», дадаюць аўтары тэксту.

Арганізацыйны камітэт па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2021 года разлічвае, што МФХ будзе «цвёрда прытрымлівацца прынцыпаў алімпізму, аб'яднальнай ролі спартыўных спаборніцтваў у інтарэсах усіх аматараў гэтага яркага і мужнага віду спорту, а не ва ўгоду амбіцыям палітычных кан'юнктуршчыкаў».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Мірны атам

100 % МАГУТНАСЦІ

Дасягнуў першы энергаблок АЭС

Учора ўвечары першы энергаблок беларускай АЭС выйшаў на намінальны ўзровень сваёй магутнасці. Цяпер ён будзе вырабляць запланаваныя 1170 МВт электраэнергіі. А цеплавая магутнасць блока — 3200 МВт, паведамляе тэлеграм-канал Мінэнерга.

На гэтым узроўні магутнасці працягнуцца статычныя і дынамічныя выпрабаванні згодна з праграмай доследна-прамысловай эксплуатацыі. Нагадаем, што этап доследна-прамысловай эксплуатацыі распачаўся на першым энергаблоку Беларускай АЭС 22 снежня, а 3 студзеня тут пачаліся новыя выпрабаванні.

— Выхад на поўную праектную нагрузку — важная з'ява. Згодна з этапнымі праграмамі, мы ўжо прайшлі асваенне магутнасці ў 75 % і 90 %, — расказаў **намеснік міністра энергетыкі Міхаіл МІХАДЗЮК**. — Вывад энергаблока на 100-працэнтную магутнасць у частцы выпрабаванняў уяўляе з сябе статычныя выпрабаванні — калі блок працуе на роўнай магутнасці без пераменнай. Пры гэтым адбываецца шэраг выпрабаванняў па іншых характарыстыках рэактарнай установкі.

Пасля на АЭС прадугледжаны комплекс дынамічных выпрабаванняў, калі нагрузка скідваецца да пэўнага ўзроўню адносна намінальнай, і нават да нуля. Гэтым этапам прадугледжана таксама планавае спыненне блока для выканання пэўных тэхналагічных работ, прадугледжаных этапнай праграмай.

Пасля паспяховага завяршэння статычных і дынамічных выпрабаванняў цягам 15 дзён будзе праведзена комплекснае апрабаванне абсталявання і сістэм энергаблока на намінальнай магутнасці. У прамысловую эксплуатацыю энергаблок будзе прыняты камісіяй пасля паспяховага завяршэння комплекснага апрабавання абсталявання.

На другім энергаблоку Беларускай АЭС зараз дадзена напружанне на ўласныя патрэбы, а таксама манціруецца абсталяванне. Там, дзе яно змантіравана, вядуцца гідраўлічныя выпрабаванні і індывідуальнае апрабаванне. Будаўнічая частка работ на блоку амаль завершана, засталіся аддзелачныя работы, якія выконваюць згодна з графікам. Плануецца, што ў першым квартале гэтыя работы завершацца, на красавік, магчыма, застанецца пракладка кантрольнага кабелю, дадаў Міхаіл Міхадзюк.

Ірына СІДАРОК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Еўропе і Азіі рэзка вырас кошт газу

На фоне халадоў у Еўропе і дэфіцыту звадкаванага газу ў Азіі назіраецца рэзкі рост цэн на «блакітнае паліва», паведаміла выданне finanz.ru. У Нідэрландах кошт газу склаў 284 долары за тысячу кубаметраў, у той час як у ліпені мінулага года ён ацэньваўся ў 70 долараў. У Іспаніі кошт узляцеў да 660 долараў за тысячу кубаметраў, што стала абсалютным гістарычным рэкордам для краіны. Апроч халадоў, еўрапейскія цэны на газ штурхаюць уверх сціплыя ў параўнанні з мінулым годам запасы паліва. У пачатку зімы ЕС меў 82 млрд кубаметраў газу ў падземных сховішчах, што на 14 млрд «кубоў» менш, чым у аналагічны перыяд 2019-га. Але ўжо ў снежні сярэдні адбор са сховішчаў удвая перавышаў паказчыкі пазамінулага года, а пастаўкі звадкаванага газу зменшыліся амаль у два разы. Яшчэ мацней цэны на газ выраслі ў Азіі: спотавыя каціроўкі на хабе JKM падскочылі ў дзесяць разоў і ў пачатку гэтага тыдня перавысілі тысячу долараў за тысячу кубаметраў. Аднак і такія высокія расцэнкі не здольныя ліквідаваць дэфіцыт на азіяцкім рынку — да прыкладу, кампанія Exxon Mobil прадала газ па цане 1250 долараў за тысячу «кубоў», паведаміла Bloomberg.

Прэм'ер-міністр Эстоніі сышоў у адстаўку на фоне карупцыйнага скандалу

Прэм'ер-міністр Эстоніі, лідар кіруючай Цэнтрысцкай партыі Юры Ратас падаў у адстаўку. «Магчымымі здаваліся розныя рашэнні, але толькі адно з іх з'яўляецца правільным», — заявіў ён. Кіраўнік Кабміна заўважыў, што застанецца на сваёй пасадзе да зацвярджэння новага ўрада. Ужо пачаліся перамовы паміж рознымі партыямі, якія заявілі, што не выключаюць ніякіх камбінацый, паведаміла навуковы супрацоўнік Універсітэта Тарту Лііза Талвінг. Па даных следства, бізнесмен Хілары Тэдэр і генеральны сакратар Цэнтрысцкай партыі Міхаіл Корб дамовіліся, што прадпрымальнік ахвяруе партыі перад мясцовымі выбарамі да мільёна еўра. У адказ звязаная з Тэдэрам фірма Porto Franco атрымае крэдыт у 40 млн еўра.

«ЗДАБЫЎ ШЧЫРУЮ ЛЮБОЎ»

Урад Беларусі і вышэйшыя службовыя асобы ў сувязі са смерцю Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі мітрапаліта Філарэта адзначылі яго заслугі для нашай краіны.

«Пачатак служэння Уладыкі Філарэта ў Беларусі праходзіў у няпросты гістарычны перыяд. Ён стаяў ля вытокаў адраджэння Беларускай праваслаўнай царквы, аднаўлення яе аўтарытэту і ролі ў грамадстве. Пад яго кіраўніцтвам адноўлена прыходскае жыццё, адроджаны епархіі, якія гістарычна існавалі на землях Беларусі, разгорнута актыўная сацыяльная і дабрачынная дзейнасць, узведзены шматлікія храмы, адноўлена работа многіх манастыроў, Мінскай духоўнай акадэміі і семінарыі, — сказана ў тэксце, які падпісалі прэм'ер-міністр, спікеры абедзвюх палат беларускага парламента, старшыні Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў Беларусі, кіраўнікі Адміністрацыі і Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, сакратарыята Савета Бяспекі, Следчага камітэта, Нацыянальнага банка, Нацыянальнай акадэміі навук, іншых ведамстваў, віцэ-прэм'еры, міністры, старшыня Калегіі ЕЭК. — Адраджаючы хрысціянскую культуру беларускага народа, захоўваючы і ўмацоўваючы яго духоўныя традыцыі, мітрапаліт Філарэт стаў добрым пастырам і мудрым настаўнікам для некалькіх пакаленняў святароў і праваслаўных вернікаў».

Светлае імя мітрапаліта Філарэта і пачуццё шчырай павагі да гэтага чалавека назаўжды застануцца ў сэрцах праваслаўных хрысціян і ўсяго беларускага народа, выказалі ўпэўненасць дзяржаўныя дзеячы краіны.

* * *

Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл выказаў духавенству і вернікам Беларускай праваслаўнай царквы спачуванні ў сувязі са смерцю Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева).

«Узлюбленыя ў Госпадзе ўладыкі, пачэсныя айцы, дарагія браты і сёстры! З глыбокім смуткам успрыняў вестку пра смерць аднаго з выдатных іерархаў — ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева). Гэта сапраўды вялікая страта не толькі для вернікаў Беларусі, але і для ўсёй нашай Царквы, — сказана ў пасланні. *Человеколюбно вся строяй и полезная всем подаваяй* Прамудры Гасподзь наканаваў пражыць новаспачыламу доўгае і поўнае стваральнай працай жыццё, якое ён з маладых гадоў аддаў служэнню на ніве Хрыстовай».

Першаіерарх Рускай праваслаўнай царквы адзначыў важкі ўклад спачылага мітрапаліта Філарэта ва ўмацаванне брацкіх сувязяў паміж Памеснымі Праваслаўнымі цэрквамі і развіццё міжканфесійнага дыялогу.

«Выконваючы розныя адказныя паслушэнствы ў Еўропе, калі быў старшынёй Аддзела знешніх царкоўных сувязяў Маскоўскага Патрыярхата, ён руплівa здзяйсняў ускладзенае на яго служэнне і здабыў шчырую любоў і павагу з боку многіх людзей за межамі сваёй краіны», — дадаў патрыярх.

«Доўгі час уладыку Філарэту давялося знаходзіцца на кафедры мітрапалітаў Мінскіх. Гады яго архіпастырскай працы ў межах Белай Русі адзначаны ўсебаковым адраджэннем царкоўнага жыцця, аднаўленнем і будаўніцтвам новых храмаў і манастыроў, развіццём духоўнай адукацыі і асветніцкай дзейнасці. Імкнучыся, паводле слова Пісання, даглядаць за паствай не па прымусе, а добраахвотна і богаўгодна, і не пануючы над набыткам Божым, а даючы прыклад (1 Пет. 5: 2-3), новаспачылы свяціцель з апостальскай рэўнасцю сведчыў блізкім і далёкім пра прыгажосць і праўдзівасць Праваслаўя, спрыяў будаванню міру і грамадзянскай згоды на Беларускай зямлі», — сказана ў спачуванні Патрыярха Кірыла.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі смуткуюць у сувязі са смерцю Героя Беларусі, Высокапраасвяшчэннага мітрапаліта Філарэта, Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, які ўнёс вялізны ўклад у адраджэнне і ўмацаванне духоўных і культурных традыцый беларускага народа, і выказваюць глыбокія спачуванні Беларускай праваслаўнай царкве, яго родным і блізкім.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў смуткуюць у сувязі са смерцю Высокапраасвяшчэннага мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева), Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, які ўнёс неацэнны ўклад у духоўнае адраджэнне беларускага народа, умацаванне міжканфесійнай згоды, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Высокапраасвяшчэннага мітрапаліта Філарэта, Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Мітрапаліт Філарэт быў духоўным настаўнікам беларускага народа амаль чвэрць стагоддзя, адраджаючы хрысціянскія каштоўнасці і традыцыі ў пераломныя 90-я гады, спрыяючы аднаўленню праваслаўных храмаў Беларусі, беручы актыўны ўдзел у вырашэнні сацыяльных праблем, дапамагаючы кожнаму знайсці сваю дарогу да Храма. Немагчыма пераацаніць яго ўклад у духоўнае станаўленне нашага грамадства.

Падзяляем смутак усіх вернікаў Беларусі.

Слова — удзельнікам

«З ПАРАХОНСКА НЕ З'ЕХАЛА Б НІКУДЫ»

Галоўны бухгалтар сельгаспрадпрыемства — пра гаспадарку, вёску і сябе

Галіна Рыгораўна падтрымлівае цесныя сувязі з былымі аднакурснікамі. Часта скідвае здымкі ў групе, дзеліцца навінамі з жыцця сваёй вёскі і прадпрыемства. Але, бывае, некаторыя ў адказ выказваюць асцярожны недавер. Ну як гэта — у сельгаспрадпрыемстве сярэдняя зарплата перавысіла 1100 рублёў? Іншыя пішуць, што надта сюжэты прыгожыя, можа, дзе ў горадзе шчоўкнула, а выдае за вёску.

А яна ўсміхаецца, кажа, што толькі рамантычныя паненкі падганяюць фота для сецівa па параметрах. Яна ж фіксуе жыццё. І яшчэ любіць сваю вёску, сваю гаспадарку і нізавошта не памяняла б месца жыхарства нават на сталіцу.

Галіна Дубіна ўжо 12 гадоў працуе галоўным бухгалтарам ААТ «Парахонскае» ў Пінскім раёне. Гэтая гаспадарка адметная не толькі ў раёне і вобласці, але і ў краіне. Па вытворчасці ялавічыны прадпрыемства недзе на другой пазіцыі ў Беларусі. А ў раённым маштабе гаспадарка выпускае 23 працэнты валавой прадукцыі, пры тым што займае усяго 15 працэнтаў тэрыторыі. Тут шмат будуюць, пастаянна ўводзяць у строй жыллё і вытворчыя аб'екты, дабіваюцца высокіх вынікаў гаспадарання на складаных меліяраваных землях.

Фінансістам у «Парахонскім» Галіна Рыгораўна

працуе з 1991 года. Гаворыць, што гаспадарка заўсёды трывала стаяла на нагах:

— Нават не прыгадаю такога перыяду, каб мы зусім не зводзілі канцы з канцамі, альбо, як кажуць, стаялі на каленях. Папярэднікі пакінулі добры падмурак, ну а наша пакаленне прадоўжыла традыцыі, і сёння з гонарам можна сказаць, што сельгаспрадпрыемства ўстойліва развіваецца. Як вынік, аграгарадок умовамі, спосабам жыцця нічым не адрозніваецца ад вялікага горада. У нас добраўпарадкаванае жыллё, прыгожыя сучасныя вуліцы. Дзеці маюць магчымасць займацца спортам, творчасцю самых розных кірункаў, для гэтага ёсць усе ўмовы. Лічу, што жыць ў нас лепш, чым у вялікім горадзе. Там, здараецца, з-за адлегласцяў і занятасці бацькоў школьнік не можа наведваць цікавую яму секцыю, а ў нас усё размешчана кампактна, любое дзіця можа дабрацца ў патрэбную ўстанову нават самастойна.

У вёсцы цудоўна арганізавана гандлёвае абслугоўванне, нават з горада, заўважаю, людзі закупляюцца ў нашых крамах. Праўда, у Парахонску няма буйных гандлёвых сетак, але наша кулінарыя гатуе столькі паўфабрыкатаў з уласнай сыравіны, што гаспадыні, асабліва маладыя, забыліся, як марнаваць час на прыгатаванне, скажам, галубцоў. Іх можна купіць і быць упэўненым у іх высокай якасці.

Ну а што такое прыстойная зарплата, думаю, не варта расказваць. Яна азначае найперш, што работнікі могуць спакойна аплачваць крэдыты, вучыць дзяцей, дазваляць сабе паездкі на адпачынак. У нас ёсць уся патрэбная інфраструктура: школы, садкі, участковая бальніца. Моладзь ад нас не збягае ў горад. Кажу гэта на прыкладзе сваёй сям'і, — працягвае суразмоўніца. — Два мае сыны ўжо скончылі ВНУ сельскагаспадарчага профілю і вярнуліся на работу ў сваю гаспадарку, трэці яшчэ працягвае вучобу. Маладыя маюць перспектыву як у забеспячэнні жыллём, так і ў прафесійным росце. Усе маладыя спецыялісты атрымліваюць кватэры. Гэтае жыллё даволі хутка вызваляецца, бо многія аддаюць перавагу будаўніцтву ўласнага дома, ды і гаспадарка ўзводзіць катэджы.

Вось чаму і гавару, што люблю сваю вёску і сваю вытворчасць: калі бачыш вынікі сваёй працы, яе сэнс, калі ёсць умовы для жыцця і работы, то ёсць настрой жыць і працаваць. Думаю, што менавіта ў тым кірунку, які мы асвойваем, і павінна развівацца сельскагаспадарчая галіна краіны. На першым месцы — паспяховая, эканамічна абгрунтаваная вытворчасць, за ёй ідзе абавязковае развіццё інфраструктуры. Калі гэта ёсць, то з'явіцца трэці складнік у выглядзе культурных праектаў, грамадзянскіх ініцыятыў. Гэта я назіраю як дэпутат сельскага Савета. Моладзі ў нас дастаткова, яны пастаянна ініцыююць экалагічныя, краязнаўчыя, іншыя акцыі і становяцца іх актыўнымі ўдзельнікамі. Людзі ўсіх пакаленняў займаюцца спортам, удзельнічаюць у самадзейных калектывах, выязджаюць на канцэрты і прымаюць гасцей-артыстаў. Бібліятэкары ў нас не сумуюць на рабоце, задзейнічаны ўстановы культуры. Вось чаму я гаварыла, што ні ў якім разе не з'ехала б з Парахонска. Наша жыццё залежыць ад нас саміх, — падсумавала Галіна Дубіна, якая абраная дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Пагадзіцеся, ёй ёсць аб чым расказаць і важна пачуць, чым падзеляцца іншыя ўдзельнікі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПРЫМНОЖЫЦЬ ЗДАБЫТКІ

Сёлета вынікі конкурсу «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» імя А. Дубко падвялі ў дваццаць другі раз. За гэты час лаўрэатамі стала больш за 200 чалавек. Цырымонія традыцыйна праходзіць напярэдадні дня нараджэння Аляксандра Дубко з удзелам яго жонкі Эмы Нікіфараўны.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК, лаўрэат прэміі імя А. Дубко старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз мастакоў» Міхаіл БАНДАРЧУК і Эма ДУБКО.

Мерапрыемства стала знакавай падзеяй рэгіёна. Падчас калядных свят урачыста ўшаноўваюцца найлепшыя прадстаўнікі культурнай галіны ў 14 намінацыях. Гэта і музейны работнік, і бібліятэкар, і выкладчык, і народны майстар, і артыст, і мастак, і музыкант...

Па словах старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Караніка, сімвалічна, што конкурс носіць імя Аляксандра Дубко, чалавека шырокай душы, працаўніка, патрыёта свайго краю, які шмат зрабіў для яго развіцця падчас работы на пасадзе старшыні Гродзенскага аблвыканкама. І гэта менавіта яго ідэя — зрабіць такі конкурс для падтрымкі творчых людзей.

— Мы падтрымліваем нашых прафесіяналаў, каб захаваць гэтыя здабыткі. А Беларусь, і Прынёманскі край у тым ліку, вельмі багатыя на культурныя традыцыі, якія абавязкова трэба захаваць і перадаць наступным пакаленням. І важна, каб колькасць энтузіястаў сваёй справы павялічвалася, — заўважыў **Уладзімір КАРАНІК.**

Па словах арганізатараў, прэстыж конкурсу з кожным годам расце. За больш чым 20-гадовую яго гісторыю выросла і колькасць намінацый — з 9 да 14. Пры гэтым журы з кожным разам усё цяжэй выбіраць пераможцаў. Летась, напрыклад, на ўдзел у конкурсе было прадстаўлена 45 прэтэндэнтаў.

— Прыемна, што ў гэты дзень адбываецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. За апошнія некалькі гадоў колькасць стыпендыятаў фонду патроілася і складае 116 чалавек. Менавіта сімбіёз моладзі і вопыту — гэта, лічу, самы моцны сплаў. Таму сімвалічна, што ў зале знаходзяцца як захавальнікі традыцый нашай культуры, так і крэатыўная моладзь, — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна.

Мікалай Бандарчук — адзін з тых, хто неаднойчы станавіўся пераможнікам конкурсу. Сёлетнюю перамогу ён звязвае з мастацкім увасабленнем свайго бачання гераізму абаронцаў Радзімы падчас Вялікай Айчыннай вайны. Яго карціна «Дот» выстаўлена у Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску. Мастак пісаў з натуры, бо ў рэгіёне захавалася нямала такіх ваенных збудаванняў.

А вось выкладчыца музычнай школы з Мастоўскага раёна Галіна Мішурына ганаровую ўзнагароду атрымлівае ўпершыню. І хоць яна мае ганаровы тытул «Настаўнік года», абласная прэмія імя А. Дубко стала для яе прыемным сюрпрызам. А між тым музычная дзейнасць выхаванцаў Галіны Іосіфаўны ўражвае. Праўда, летась гэта былі выступленні ў анлайн-фармаце, але трапіць на міжнародныя конкурсы нават такім чынам удаецца далёка не ўсім. Мастоўскі дзіцячы хор стаў лаўрэатам конкурсу ў Італіі і атрымаў права ўдзельнічаць сёлета. Значнай падзеяй лічаць тут і ўдзел у міжнародным анлайн-фестывалі ў Грэцыі. Зараз калектыў рыхтуецца да рэспубліканскага конкурсу «Вясновы спеў», які праходзіць у Мінску раз у два гады.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асцярожна!

Цюбінг і іншыя небяспечныя забавы

Медыкі фіксуюць усплёск траўматызму

Варта было прыйсці ў Беларусь сапраўднай снежнай зіме, што якраз супала з вялікімі выхаднымі, — і медыкі адзначаюць усплёск траўматызму.

«Штодзень у прыёмны пакой звяртаецца пяць-шэсць чалавек з траўмамі пазваночніка, як правіла, кампрэсійнымі пераломамі, звязанымі з катаннем на цюбінгах. Тры-чатыры чалавекі з цяжкімі пашкоджаннямі прывозяць на выхадных з гарналыжных комплексаў «Сілічы» і «Лагойск», — адзначае **выконваючы абавязкі загадчыка прыёмнага аддзялення РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Аляксандр ЯРАШЭВІЧ.** Больш за чатыры дзясяткі дзяцей звярнулася падчас мінулых выхадных у прыёмны пакой Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай нейрахірургіі з чэрапна-мазгавымі траўмамі, страсеннямі, пераломамі. Медыкі нагадалі простыя правілы падчас актыўнага зімовага адпачынку, якія павінны выконваць дзеці і дарослыя.

— У апошнія пяць гадоў цюбінгавая траўма зімой выйшла на першае месца. Забараніць катацца на цюбінгах немагчыма. Але ўсе павінны ўсведамляць, чым ён адрозніваецца ад санак і лядзянак. Калі падчас катання на санках ёсць магчымасць затармазіць нагамі, змяніць накірунак ці, нарэшце, выпасці з іх, каб пазбегнуць сутыкнення, то на цюбінгу ногі, як правіла, не дастаюць да зямлі і немагчыма ні затармазіць, ні змяніць траекторыю. Гэта хуткі бескантрольны рух з кручэннем, — тлумачыць **кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай нейрахірургіі, галоўны пазаштатны спецыяліст па дзіцячай нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Міхаіл ТАЛАБАЕЎ.** — Калі наперадзе перашкода — прыпаркаваны аўтамабіль, жалезная дваровая канструкцыя, іншы чалавек, траўма непазбежная. Толькі за панядзелак у прыёмны пакой звярнулася 16 чалавек, шасцёра шпіталізаваныя. Нейрахірург падкрэслівае, што катацца можна толькі ў спецыяльна абсталяваных месцах. Ён адзначае, што дзяцей, якіх шпіталізавалі з гарналыжных цэнтраў, у яго стацыянары мінімум. Бо на добраўпарадкаваных горках няма наперадзе перашкод.

Яшчэ адно правіла бяспечнага катання — кантроль з боку дарослых.

— Бацькі ў дварах павінны аб'ядноўвацца і кантраляваць усіх дзяцей наверсе горкі і на спуску, — раіць спецыяліст.

Аляксандр Ярашэвіч тлумачыць, што з прычыны закрытых граніц беларусы накіраваліся адпачыць у гарналыжныя цэнтры ў нашай краіне. І раіць не пераацэньваць свае магчымасці.

Спецыяліст адзначыў, што апошнім часам нярэдкія і траўмы па неасцярожнасці. Кароткі светлавы дзень, вялікая колькасць аўтамабіляў у дварах, спешка і нязручны абутак — усе гэтыя фактары вядуць да падзенняў і траўміраванняў. У тым ліку і пажылых людзей. А для іх падзенні асабліва небяспечныя — як правіла, яны заканчваюцца траўмай тазасцегнавога сустава, што ў сталым узросце мае цяжкія наступствы. Таму пажылым людзям не варта нагружаць сябе цяжкімі сумкамі, трэба не саромецца браць з сабой палку, абуваць падыходзячы да надвор'я абутак з шырокай падэшвай.

Згодна са статыстыкай, штогод у Беларусі траўмы атрымлівае каля 700 тысяч чалавек. Траўміраванне з'яўляецца адной з вядучых прычын смяротнасці і знаходзіцца на чацвёртым месцы.

Алена КРАВЕЦ.

Эканоміка і не толькі

АДНАВІЛІ ДАСТАЎКУ ЛЕКАЎ

У Беларусі зноў дазволілі дастаўку лекаў і іншых аптэчных тавараў — гэтым разам да 1 ліпеня. Першымі сэрвіс перазапусцілі аптэчныя сеткі ADEL і «Добрыя лекі». Кур'еры развозяць заказы ў Мінску і абласных цэнтрах пры куплі ад 30 рублёў.

А ўпершыню дастаўку гэтых тавараў дазволілі ў маі мінулага года на піку першай хвалі каранавіруса. У зацверджаны ўрадам спіс увайшлі 29 аптэчных арганізацый, але на справе сэрвіс запусцілі толькі некалькі буйных сетак. Ды і працаваў ён нядоўга: 1 ліпеня скончылася дзеянне дазволу, а падаўжаць яго не сталі. Аднак пілотны праект рэанімавалі праз пяць месяцаў — 30 снежня быў падпісаны Указ № 512, які дазволіў аптэчным сеткам развозіць лекі пакупнікам да 1 ліпеня 2021 года.

Як і раней, замовіць можна толькі дастаўку безрэцэптурных лекаў і спадарожных тавараў — касметыкі, сродкаў гігіены, медтэхнікі і прадуктаў харчавання. А вось БАДы і прэпараты, якія патрабуюць рэцэпта ці адчувальныя да тэмператур, можна папрасіць даставіць у найбліжэйшую аптэку і потым забраць самавывазам.

Аптэчныя сеткі ADEL і «Добрыя лекі» пасля значнага перапынку пачалі развозіць лекі па дамах у Мінску і ўсіх абласных цэнтрах. Сэрвіс таксама запрацаваў у Полацку і Наваполацку. Геаграфію дастаўкі вырашылі паступова пашыраць.

У той жа час магчымасць дастаўкі ў найбліжэйшую аптэку дзейнічае таксама ў раённых цэнтрах. Для выбару месца самавывазу даступныя больш за 320 аптэк ва ўсіх рэгіёнах.

Сяргей КУРКАЧ.

Кніжная паліца

Ці быў знаёмы Уладзімір Караткевіч з Канстанцінам Паустоўскім?..

Сярод падарункаў да юбілею аўтара «Дзікага палявання караля Стаха» — і кніга гісторыка літаратуры Анатоля ВЕРАБ'Я

У выдавецтве «Беларуская навука» пабачыў свет зборнік выбраных артыкулаў пра Уладзіміра Караткевіча «Блізкае і дарагое». Аўтар — кандыдат філалагічных навук Анатоль Верабей. Нагадаем, што дасведчаны літаратуразнавец, гісторык беларускай літаратуры, шматгадовы выкладчык філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1990 — 2020 гг.), мэтанакіравана і паслядоўна займаецца даследаваннем жыцця і творчасці

класіка беларускай літаратуры, аўтара неўміручых твораў «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі», іншых раманаў, аповесцяў, апавяданняў, п'ес, вершаў... У 1985 годзе выйшла кніга А. Вераб'я «Жывая повязь часоў: Нарыс творчасці Уладзіміра Караткевіча». Пасля да чытача прыйшлі яго кнігі «Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча» (1997; даследванне было адзначана Літаратурнай прэміяй імя Уладзіміра Калесніка Саюза беларускіх пісьменнікаў), «Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць» (2005). Дзякуючы намаганням літаратуразнаўцы ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» рэалізоўваецца праект па выданні Збора твораў У. Караткевіча ў 25 тамах. Так фанатычна, самаахвярна служыць справе захавання і пашырэння спадчыны класіка хіба што толькі Анатоль Верабей.

Новая кніга ўяўляе сабой зборнікі артыкулаў, надрукаваных у розныя гады. Уважлівае знаёмства з імі падказвае, што і ў гэтым выданні даследчык імкнецца да стварэння цэласнага партрэта шматаблічнага пісьменніка. Пра гэта сведчаць ужо і самі назвы раздзелаў, у якіх згрупаваныя артыкулы: «Праблемы жыцця і творчасці»; «Беларускі літаратурны кантэкст»; «Сусветны літаратурны кантэкст»; «Рэгіянальны кантэкст». Творчасць, пісьменніцкая біяграфія Уладзіміра Караткевіча разглядаецца ў судакрананні з Францыскам Скарынам, Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам, Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам, Уладзімірам Жылкам. А. Верабей паказвае адносіны класіка са сваімі сучаснікамі — з Максімам Танкам, Юльянам Пшырковым, Янкам Брылём, Уладзімірам Калеснікам, Васілём Быкавым, Генадзем Кісялёвым, Алегам Лойкам, Адамам Мальдзісам.

Адным з любімых пісьменнікаў У. Караткевіча быў Канстанцін Паустоўскі. А. Верабей адзначае: «Уладзіміра Караткевіча многае збліжае з К. Паустоўскім. Абодва пісьменнікі вучыліся ў Кіеўскім універсітэце, там фарміраваліся яны як асобы і творцы. І адзін, і другі былі нястомнымі вандроўнікамі. Яднае іх і глыбокая духоўная роднасць.

У лісце да К. Паустоўскага ад 26 сакавіка 1965 г. У. Караткевіч пісаў: «Дорогой Константин Георгиевич!

Заранее прошу извинить меня за то, что, быть может, отниму у Вас несколько минут рабочего времени. Но ведь может случиться так, что человеку уже нельзя не написать старому, испытанному другу, пусть даже этот друг и не подозревает о твоем существовании. А вы для меня именно такой друг в любую минуту жизни...»

Дарэчы, існуе пазнака на рукапісе п'есы У. Караткевіча «Кастусь Каліноўскі», што твор быў закончаны ў Тарусе 30 жніўня 1963 г. А пад уражаннем той паездкі было напісана апавяданне «Барвяны шчыт». Ёсць ва Уладзіміра Караткевіча і паэма «Таруская віла». Тэматычна твор звязаны з дарагім для К. Паустоўскага горадам Таруса ў Калужскай вобласці.

А. Верабей перакананы ў тым, што класікаў рускай і беларускай літаратуры «... збліжае рамантызм іх творчасці. Думаецца, што У. Караткевічу імпанавалі думкі рускага пісьменніка пра тое, што «рамантычная настроенасць не дазваляе чалавеку быць хлуслівым, цёмным, баязлівым і жорсткім», што ў рамантыцы заключаецца высакародная сіла. У апавяданні «Лятучы галандзец» У. Караткевіч сцвярджаў, што каб не зачарсцвець душою, трэба верыць у легенды, не страчваць светлага і чыстага ўспрымання рэчаіснасці».

Кастусь ЛЕШНІЦА.

«АХВОТНЫХ НАСТОЛЬКІ МНОГА, ШТО СКОНЧЫЛІСЯ БЛАНКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нагадаем, што так званы дарожны збор увялі з 2014 года і ён быў прывязаны да тэхагляду. Калі не заплаціш адпаведную суму, талон тэхагляду не атрымаеш. І колькасць выдадзеных дазволаў на допуск да ўдзелу ў дарожным руху пачала паступова змяншацца з 2015 года, прыкладна па 15—20 % штогод — кіроўцы ігнаравалі тэхагляд. У 2020-м колькасць аўтамабіляў, якія яго прайшлі, дасягнула рэкордна нізкіх лічбаў. Паводле звестак УП «Белтэхагляд», за студзень—кастрычнік мінулага года выдадзена ўсяго 619 919 дазволаў на допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху пры 4 384 870 зарэгістраваных у краіне транспартных сродкаў. Гэта на 36,7 % менш за аналагічны паказчык 2019 года і складае толькі 14 % ад усяго аўтамабільнага парку.

Чаканне выдатна дэманструе тэмперамент кіроўцаў: хтосьці ўвесь час сядзіць у аўтамабілі, нехта перыядычна выходзіць пакурыць, мужчына перад намі пастаянна змятае шчоткай нябачныя сняжынкі з даху і шкла сваёй машыны.

Але 1 студзеня ў Падатковы кодэкс былі ўнесены змяненні: цяпер адменена дзяржпошліна, прывязаная да тэхагляду, а ўведзены падатак для ўладальнікаў транспартных сродкаў.

Гэтыя змены паказалі: большасць беларусаў ігнараваць тэхагляд намеру не маюць. У выніку з першых дзён новага года на станцыях дыягностыкі ўтварыліся немалыя чэргі. А УП «Белтэхагляд» падзялілася лічбамі за першыя дзесяць дзён студзеня. За гэты час выдадзена 53 925 дазволаў на допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху. Прырост склаў 193,7 % (!) да аналагічнага перыяду 2020 года. Для прыкладу, за ўвесь снежань мінулага года выдадзена менш дазволаў, чым за першую дэкаду студзеня — 51,4 тысячы. Пры гэтым больш за 95 % дазволаў у новым годзе атрымалі фізічныя асобы.

У сувязі з тым, што колькасць ахвотных прайсці тэхагляд вырасла ў разы, на некаторых станцыях нават утварыўся недахоп бланкаў дазволаў на допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху. Але гэта «Белтэхагляд» абяцае выправіць у найбліжэйшы час.

...Дамаўляемся з сяброўкай паспрабаваць прайсці тэхагляд у будны дзень і прыязджаем на адну са сталічных дыягнастычных станцый. Можна было папярэдне запісацца, але запісваюць толькі дзве машыны на кожную гадзіну, усе астатнія праходзяць па жывой чарзе. Яе мы і выбіраем. Да самой працэдуры таксама падыходзім з усёй жаночай легкадумнасцю — прыязджаем без папярэдняй падрыхтоўкі. На месцы высвятляем, што ў «Фольксвагене» сяброўкі не гарыць адзін з задніх ліхтароў. У сваім я заўважаю разбітую супрацьтуманную фару. Выпраўляць недахопы едзем на бліжэйшую СТА. Паколькі замяніць лямпачку ў ліхтары — хвілінная справа, а чакаць дастаўкі новай супрацьтуманнай фары варта пару гадзін, пачынаем з тэхагляду «Фольксвагена» сяброўкі.

Перад ім — мыйка. У маім выпадку гэта было стратэгічнай памылкай, але пра яе пасля. Тэхагляд пачынаем з аплаты. Мужчына перад дзвярыма раіць нам усё ж спачатку заняць чаргу на лінію. «Я праходзіў тэхагляд яшчэ ў снежні — быў адзіны. Цяпер чарга пачынаецца на супрацьлеглым баку будынка», — папярэджвае ён нас. Аплачваем 8.40 праз м-банкінг (гэта допуск да тэхагляду) і 29.50 праз касу (уласна сам тэхагляд). І ацэньваем памер бедства — наўскідку перад намі па перыметры будынка стаіць машын 20—25. На дзіва, чарга прыкметна рухаецца. Прычым працуюць дзве лініі. Па нашых прыблізных падліках вароты на кожнай з іх паднімаюцца для дзве плыні перад заездам на лінію. Прыемна, што тут вырашылі пра нас паклапаціцца такім чынам.

Чаканне выдатна дэманструе тэмперамент кіроўцаў: хтосьці ўвесь час сядзіць у аўтамабілі, нехта перыядычна выходзіць пакурыць, мужчына перад намі пастаянна змятае шчоткай нябачныя сняжынкі з даху і шкла сваёй машыны. Тэхагляд, і асабліва доўгая чарга да яго — справа нервовая.

О, здаецца, гэта ніколі не скончыцца! Але ўсё ж дзякуй за тое, што пашкадавалі і далі другі шанц. Сушка, дарэчы, дапамагла — тармазы ў рэшце рэшт прайшлі выпрабаванне.

Пакідаю перад самым заездам на станцыю сяброўку і іду забіраць свой аўтамабіль з новай супрацьтуманкай. Мне давядзецца паўтарыць працэдуру: мыйка — аплата ў касу — чарга. На вуліцы пачынае цямнець, але нягледзячы на набліжэнне заканчэння працоўнага дня, машын, здаецца, стала крыху менш. Па маіх падліках, можна паспець да закрыцця станцыі.

Яшчэ гадзіна з невялікім стаяння — і перад маёй машынай паднімаюцца вароты для заезду на лінію. Адчуваецца, што супрацоўнікі станцыі засумавалі па рабоце праз яе адсутнасць у мінулыя месяцы. Усё настолькі хутка, што часам не паспяваеш асэнсаваць каманды (і настолькі шумна, што не заўсёды іх чуеш). Уключыце блізкае святло, далёкае, супрацьтуманныя фары, заднюю перадачу, габарыты... «Я прасіў уключыць габарыты, а вы ўключаеце блізкае святло», — добра, што гэта не экзамен у аўташколе, мяне б чакаў ганебны правал. «Падайце гукавы сігнал — о, вас жа ніхто не пачуе», — з жартамі і весялосцю працэс працягваецца. «Не працуе абдзіманне шкла? А не, усё ж працуе», — сам пытае і сам адказвае майстар, бо я не паспяваю ўставіць ні слова. Пры гэтым ён праверыў, здаецца, абсалютна ўсё: лабавое шкло, адкрыванне дзвярэй, работу рамянёў бяспекі. Вердыкт на першым этапе — неабходна адрэгуляваць святло супрацьтуманных фар.

Наступнае выпрабаванне — тармазны стэнд. Па камандзе я націскаю на тармазы і не разумею, чым азадачаны чарговы майстар. «На мыйку заязджалі?» — «Так», — адказваю. — «Праз тое, што вада і «хімія» маглі трапіць на тармазныя калодкі, у вас яны дрэнна працуюць. Паедзеце на вуліцу пасушыце, потым без чаргі заедзеце зноў». О, здаецца, гэта ніколі не скончыцца! Але ўсё ж дзякуй за тое, што пашкадавалі і далі другі шанц. Сушка, дарэчы, дапамагла — тармазы ў рэшце рэшт прайшлі выпрабаванне.

На апошнім этапе — «яме» — высвятляецца, што мне патрабуецца замена элементаў падвескі — абедзвюх шаравых апор. Фінальны надпіс над выязнымі варотамі «Дзякуй, што выбралі нас» — і я на свабодзе з чыстым сумленнем. Не так і дрэнна, як магло б быць, улічваючы паважаны ўзрост нашых аўтамабіляў, вырашаем мы з сяброўкай. У яе, дарэчы, таксама выявілі праблемы — з глушыцелем. Нам выдаюць дыягнастычныя карты з апісаннем няспраўнасцяў. На выпраўленне (правяраць наступны раз будуць толькі іх) адводзіцца 20 дзён, цягам якіх нас зноў чакаюць на станцыі. «Сардэчна запрашаем» і «Дзякуй, што выбралі нас».

Алена КРАВЕЦ.
Фота аўтара.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

14 СТУДЗЕНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15900)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Анжаліка ПУШНОВА:

«Людзі думаюць, што ў маім жыцці не бывае суму...»

Спявачка, артыстка, вядучая АНТ, аўтар рубрык «Дзяжурная па горадзе» і «Навіны музыкі» (якія зараз знаходзяцца на часовай «перазагрузцы») — яна толькі нядаўна скончыла факультэт журналістыкі, а ўжо скарае вяршыні тэлебачання і айчыннага шоу-бізнесу. Заўсёды адкрытая і прыязная дзяўчына пагадзілася знайсці час у сваім шчыльным графіку і адказаць на пытанні «Чырвонкі. Чырвонай змены».

— Раскажы, як нараджаліся ідэі для тваёй рубрыкі «Дзяжурная па горадзе»?

— Сюжэты ўзнікалі вельмі проста. Я магу есці марожанае, потым паглядзець на дзяцей, і ў галаву прыходзіць ідэя прапанаваць мінчанам прыгадаць сваё дзяцінства і адказаць на мае пытанні. Насамрэч, тэм вельмі шмат, варта проста паглядзець вакол сябе. Заўсёды трэба звяртаць увагу на дэталі.

— У журналістыцы на каго раўняешся?

— Калі вучылася на журфаку, вельмі моцна захаплялася Опрай Уінфры, вучылася ў яе таму, як знайсці падыход да кожнага. Потым гэты навык спатрэбіўся мне для згаданай рубрыкі. Таксама яна навучыла мяне пазітыўнаму стаўленню да жыцця, мэтанакіраванасці і аптымізму.

— Ці чакаць ад цябе новых аўтарскіх праграм?

— Вельмі спадзяюся, што яны яшчэ будуць, бо калі ішла на канал, хацела весці сваю вялікую аўтарскую праграму. І я да гэтага іду, разумеючы, што не ўсё адбываецца адразу.

Памятаю, як прынесла пяць рубрык, з якіх выбралі толькі «Дзяжурную па горадзе». Тады мне прапанавалі проста паспрабаваць, думалі, што нічога ў мяне не атрымаецца. Але ўсё склалася ўдала, потым з'явілася яшчэ музычная рубрыка. Мяркую, што самае галоўнае — мець ідэі і жаданне.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Мэта на «мільён»

НЕ РАЗМАЎЛЯЙЦЕ З ДЗЕЦЬМІ З ПАЗІЦЫІ «КУДЫ ТЫ НАЦЭЛІЎСЯ»

Чаму бацькам выпускніка важна своечасова заняць месца ў групе падтрымкі?

Заканчэнне школы і выхад у дарослае жыццё прафарыентацыйны псіхолаг Ганна ІСАЕНКА вельмі трапна параўноўвае з першым скачком з парашутам або выхадам у космас. Свет ужо ўвайшоў у стадыю турбулентнасці, наша будучыня — абсалютна непрадказальная, таму ніхто не бярэцца рабіць доўгатэрміновыя прагнозы і разважаць пра «надзейныя прафесіі», а тут яшчэ і пандэмія каранавіруса дадаткова ўсё ўскладніла, збылтала многім іх жыццёвыя планы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свой выбар

ФОРМА І ДЫСЦЫПЛІНА ПАГРАНІЧНІКА,

або Заўсёды быць першым!

Летам мінулага года ў Мінску на базе сярэдняй школы № 206 быў створаны першы і адзіны ў сталіцы клас пагранічнай накіраванасці.

— Наш праект сапраўды ўнікальны, хоць наогул класаў з ваеннай скіраванасцю ў сталіцы вялікая колькасць. Але менавіта памежны — толькі ў нас, — расказала **намеснік дырэктара па навучальнай частцы Таццяна НОВІКАВА.** — Ідэя стварыць нешта падобнае з'явілася ў сценах школы даволі спантанна. Так атрымалася, што ў нашым раёне ў новыя дамы пачалі засяляцца ваенныя, і многія з іх былі пагранічнікамі. Яны пачалі прыводзіць да нас на вучобу сваіх дзяцей і адразу ж уключыліся ў школьныя працэсы: прапаноўвалі мноства майстар-класаў і іншых мерапрыемстваў. Адміністрацыя скарысталася такой сітуацыяй і папулярнасцю згаданай службы сярод моладзі і, абгаварыўшы ўсё з Інстытутам пагранічнай службы, вырашыла адкрыць на базе навучальнай установы клас з адпаведнай скіраванасцю.

Першапачаткова кіраўніцтва школы думала набіраць дзяцей з пятага класа, але, прыслухаўшыся да парад калег, якія ўжо мелі вопыт у падобнай справе, надумала пачаць з дзясятага. Бо ў такім узросце вучні ўжо больш выразна ўяўляюць сябе ў будучай прафесіі, і за два гады могуць старанна падрыхтавацца не толькі да цэнтралізаванага тэсціравання, але і, дзякуючы ўхілу, да ваеннай службы.

Для таго, каб патрапіць у пагранічны клас, трэба прайсці сур'ёзны адбор. Першым крытэрыем з'яўляецца добрая фізічная падрыхтоўка і стапрацэнтнае здароўе. Другім — сярэдні бал, не ніжэйшы за «7», і добрае веданне матэматыкі і англійскай мовы, бо гэта асноўныя прадметы для паступлення ў вышэйшую ўстанову на згаданую спецыяльнасць.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
14 01 2021 г.

НЕ РАЗМАЎЛЯЙЦЕ З ДЗЕЦЬМІ З ПАЗІЦЫІ «КУДЫ ТЫ НАЦЭЛІЎСЯ»

А ХТО ТАМ ЗА РУЛЁМ?

— Маладыя людзі пачынаюць усведамляць, што зусім неабавязкова яны змогуць дасягнуць нават таго ўзроўню дабрабыту, якога дасягнулі іх бацькі. Таму, адпаведна, выбар, кім быць, як будаваць свае планы на дарослае жыццё і як зарабляць грошы на свае патрэбы стаіць для іх вельмі востра, — расказала Ганна Ісаенка падчас свайго выступлення на EdCamp Belarus. — Калі я кансультую старшакласнікаў, то кажу ім: «Вам вельмі пашанцавала і вы ўступаеце ў дарослае жыццё без ілюзій, у адрозненне, напрыклад, ад мяне. Майму пакаленню падавалася, што наша жыццё будзе ісці па дакладным сцэнарыі. Можна было выбраць адну прафесію і прысвяціць ёй усё жыццё. Прыкладна праз пяць гадоў пасля заканчэння ВНУ атрымаць першае павышэнне на службе, праз дзесяць — другое, праз дваццаць — заняць кіраўніцкую пасаду і потым спакойна пайсці на пенсію. У цяперашнім свеце маладому чалавеку неаднойчы давядзецца змяняць род сваіх заняткаў, тым больш што пенсійны ўзрост у нас паступова павышаецца. Выбіраць прафесію ў ідэале трэба ў 15-17 гадоў, да гэтага ж часу неабходна паспрабаваць сябе ў розных ролях, каб праявіць сваю адоранасць. А бацькам важна зразумець, што адбываецца, і перастаць змагацца з яе праявамі.

Чым дзяцінства адрозніваецца ад дарослага жыцця? Пакуль ты малы, ты едзеш на заднім сядзенні аўтамабіля, якім кіруюць бацькі. Менавіта яны пракладваюць маршрут, вырашаюць, дзе зрабіць прыпынак, дзе падсілкавацца і гэтак далей. Але прыходзіць час, калі дзіця ўпершыню «бярэ руль» у свае рукі. І калі гэта не здарыцца ў 17 гадоў... У 30 да мяне прыходзіць малады чалавек, які кажа, што ў яго ўсё ёсць (і адукацыя, і работа), але ўсё гэта было не яго выбарам. Ён проста ўвасабляў чаканні бацькоў... Таму я заўсёды кажу старшакласнікам: не трэба скардзіцца ні на надвор'е, ні на складаныя ўмовы на дарозе. Трэба вучыцца ездзіць і ў галалёд, і ў завіруху. Гэта ўсё ўмовы задачы, якую неабходна вырашыць. І нікому не выдаецца гарантыя, што яго жыццё будзе спакойнае і шчаслівае, нават калі тваё прозвішча Ракфелер.

Я заўсёды прашу прыйсці на кансультацыю разам з бацькамі, таму што выбар прафесіі — гэта перадача руля ў сістэме ўзаемадносін «бацькі—дзіця». І кажу ім: «З гэтага моманту вы становіцеся для свайго дзіцяці навігатарам, яго фанклубам, групай падтрымкі. Але выбар прафесіі — гэта менавіта той выпадак, калі самы час адысці ўбок і даць магчымасць вызначыцца». А я падчас кансультацыі бяру на сябе ролю інструктара па ваджэнні, расказваю пра ўсе магчымасці і варыянты і дапамагаю прыняць правільнае рашэнне.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

ЗА МЕЖАМІ ЗДАРОВАГА СЭНСУ

Па словах Ганны Ісаенкі, вельмі важнае значэнне мае мэта, якую мы перад сабой ставім, чаго жадаем дамагчыся ў жыцці.

— Тут патрабуюцца амбіцыйнасць, смеласць і, я сказала б, па-добраму нават нахабнасць. Інакш як салдат можа стаць генералам? Хтосьці пра паспяховага чалавека можа сказаць: «Яму пашанцавала». Не, проста ён умеў марыць. Пасля таго, як мы ставім сабе амбіцыйную мэту, пачынаем бачыць сродкі для яе дасягнення і не ўпускаем магчымасцяў. Наша псіхіка ўладкавана так, што бачым мы толькі тое, што мае адносіны да нашых патрэб, а ўсё астатняе застаецца для нас проста фонам. Калі наша мэта — на «мільён», мы бачым увесь спектр сродкаў для яе

Фота дадзена EdCamp.

дасягнення, а калі задача больш сціплая — то з вялікай доляй верагоднасці не заўважым усе магчымасці, якія не прапусцім, паставіўшы сабе грандыёзную задачу. А калі мы яшчэ і пачынаем кіравацца здаровым сэнсам... У сувязі з гэтым хачу звярнуцца да педагогаў і бацькоў. Ні ў якім разе не размаўляйце з дзецьмі з пазіцыі здаровага сэнсу! Не трэба зазямляць іх фразамі кшталту: «Куды ты нацэліўся? Там цябе ніхто не чакае! У бізнесменаў ёсць свае дзеці, якім тыя будуць дапамагаць...» Падлетак проста павінен верыць у тое, што ён стане прэзідэнтам, генералам, паспяховым бізнесменам або высокааплатным спецыялістам. Мара — гэта тое, што выходзіць далёка за межы здаровага сэнсу і сённяшнія магчымасці чалавека. Заўважана, што сярод аўтсайдараў і геніяў — аднолькавая колькасць людзей з высокім IQ, таму справа зусім не ў вашым інтэлекце.

Першы складнік поспеху — гэта мэта, другі — сродкі, а трэці — праактыўнасць. Трэба падняць з канапы сваю «пятую кропку» і штосьці рабіць, ісці на мерапрыемства, што зацікавала ў «Фэйсбуку», выступіць там. Нават няўдалае выступленне лепшае за тое, што ўвогуле не адбылося. І ўжо дакладна не трэба чакаць поспеху ад кожнага здзейсненага кроку. Да яго прыводзяць толькі дзесяць працэнтаў дзеянняў. Галоўнае — не сядзець на месцы. Будзе мэта — знойдзецца і патрэбная вам нятхняльная гісторыя поспеху.

Ганна Ісаенка расказала, што часта падчас кансультацыі вельмі чуецца чым заўгодна. Але ў гэтай свабоды ёсць жорсткая цана пытання — трэба самому здабываць сабе ежу. Яму ніхто не налье вады, не пакліча ветэрынара. Але калі навучыўся паляваць, ты прыгажун! Спрытны і смелы! А дамашні кот несвабодны, затое ў яго ўсё стабільна, галоўнае — прытрымлівацца правіл, устаноўленых гаспадаром. Калі вы наёмны работнік, то працуеце на мэты свайго працадаўца, а як толькі вашы і яго мэты пачынаюць разыходзіцца, узнікае канфлікт.

— Тут дзейнічаюць розныя правілы гульні і розныя сцэнарыі дарослага жыцця. З «дзікімі катамі» я магу размаўляць, напрыклад, пра стартапы і першыя крокі ў прадпрымальніцтве, — кажа Ганна Ісаенка. — Мушу канстатаваць, што наша школа арыентавана больш на «дамашніх катоў», бо «дзікія» вучаць толькі тое, што ім насамрэч цікава і патрэбна. Далей мы шукаем рэсурс, за кошт якога будзем узлятаць. Вядома, што 80 працэнтаў паліва ракета выдаткоўвае на старце, а для таго, каб стаць прафесіяналам, патрабуюцца 10 тысяч гадзін упартай працы. Яны могуць прайсці па-рознаму: як катарга або як шчасце, калі чалавек абраў прафесію, зыходзячы са сваёй адоранасці, — заўважае псіхолаг. — А такая сфера ёсць у кожнага, галоўнае — яе распазнаць. Вы ведаеце, у чым заключаецца феномен яўрэйскай мамы? Яна выхоўвае сваіх дзяцей з цвёрдай верай у сябе, менавіта таму сярод прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці столькі

РОЗНЫЯ СЦЭНАРЫІ

Прафкансультант прапануе падлетку параўнаць сябе з... катом. Кім ты хочаш быць: дзікай ці дамашняй жывёлінай? Дзікі кот — абсалютна свабодны: ён гуляе, дзе пажадае, хоча — залазіць на дрэва ці на дах, а хоча — качаецца па траве, харпаспяховых у самых розных сферах нашага жыцця людзей. А мы часта назіраем, як вельмі разумны, але рэфлексіўны і няўпэўнены ў сабе чалавек топчацца на месцы, бо бачыць на сваім шляху шмат перашкод і сумняваецца. Вось чаму вельмі важна выхоўваць дзяцей з верай у сябе — гэта іх галоўны пункт апоры. На жаль, часта дводзіцца чуць ад маладых людзей: «А што, так можна было?» У кожнага абавязкова павінен быць не толькі план А, але і план В, і нават план С.

АДОРАНАСЦЬ — ЯШЧЭ НЕ ГАРАНТЫЯ

Па словах псіхолага, ёсць розныя віды адоранасці: акадэмічная, мастацкая, практычная, прастораваяя, духоўная, камунікатыўная, эмацыянальная, міжасобасная... У школе лепш за ўсё бачаць акадэмічную — схільнасць да навукі і інтэлектуальнай дзейнасці. Звычайна, калі настаўнік-прадметнік заўважае бляск у вачах дзіцяці, ён адразу заманьвае яго на факультатывы, рыхтуе да алімпіяд. Сустрэча зацікаўленага настаўніка і адоранага вучня — вялікае шчасце для абодвух. Іншая справа, калі ў дзіцяці не акадэмічная адоранасць, у гэтым выпадку яно можа застацца без падтрымкі. І добра, калі яно ад гэтага не зламаецца...

— Такога, каб дзіця зусім нічым не цікавілася, не бывае. Бывае няўважлівасць бацькоў, нежаданне прымаць абраную сынам ці дачкой справу. Здараецца, яны прыводзяць да мяне дзяцей і просяць растлумачыць ім, што іх захапленні несур'ёзныя, — кажа Ганна. — У мяне ёсць любімае пытанне да «зусім безнадзейных» дзяцей, на думку іх бацькоў: «Што ты будзеш рабіць, калі дома цэлы дзень нікога не будзе?» Настаўнікі, як і бацькі, павінны быць уважлівыя да любой праявы адоранасці. Гэта ў першую чаргу наднарматыўная актыўнасць — справа, якой дзіця гатова займацца ўвесь вольны час, нават насуперак іншым. Мне кажуць: «А калі яно проста ўвесь час глядзіць серыялы ці відэа ў інтэрнэце?» Цудоўна. Давайце разбірацца, што яно глядзіць! У мяне была дзяўчынка, якая сказала, што ў дзень без бацькоў прывяла б да сябе сяброў і разам з імі глядзела б кіно. Пытаюся: «Якое?» Пра героя, які імкнецца да мары і перамагае перашкоды. Навошта? Абмеркаваць, як у яго гэта атрымалася. Перад намі будучы менеджар па развіцці персаналу!

Уменне выслухаць і супержываць таксама можна ператварыць у прафесію, бо інакш чалавека з эмацыянальнай адоранасцю будуць проста выкарыстоўваць як камізэльку, у якую можна паплакаць. Эмпатыя, калі ты ўваходзіш у рэзананс з іншымі людзьмі, — гэта талент. Часта патрабуецца нейкая размова, штуршок, каб зразумець, як захапленні можна ператварыць у прафесію і дасягнуць поспеху.

У практыцы прафкансультанта нячаста здараюцца выпадкі, калі можна прасачыць, як склаўся лёс маладога чалавека праз шмат гадоў, але некалькі цікавых кейсаў Ганна Ісаенка агучыла. Вось адзін з іх. Яўгенія была выдатніцай і ў звычайнай, і ў музычнай школе. Выбірала паміж медыцынай і музыкай. Тэсціраванне паказала высокі ўзровень развіцця ў яе патэнцыйных здольнасцяў і даволі высокі каэфіцыент карыснага дзеяння іх рэалізацыі. У дзяўчыны быў ярка выражаны педантычны характар: калі яна рабіла дамашняе заданне, то выконвала ўсё ад «А» да «Я» і да глыбокай ночы. Не магла выбраць, што галоўнае, а што другаснае. Усё было для яе аднолькава важным. У выніку Яўгенія была пастаўлена перад выбарам. З яе характарам можна было быць добрым музыкантам у аркестры, але эмацыянальна «запальваць» у якасці сольнага выканаўцы і збіраць стадыёны наўрад ці атрымалася б. Для гэтага патрабуецца яшчэ і адпаведная харызма! Быць урачом-кансультантам і працаваць з людзьмі таксама не яе варыянт, затое з педантычным характарам і высокім узроўнем інтэлекту можна было стаць бліскучым навукоўцам. У выніку Яўгенія скончыла біяфак БДУ, навучалася на спецыяльнасці «мікрабіялогія». Ні адна бактэрыя не мае шанцаў ад яе схавацца! Прайшло 15 гадоў. Сёння Яўгенія з'яўляецца кандыдатам біялагічных навук, стажыравалася ў Ізраілі, цяпер працуе ў Канадзе.

У Яўгеніі была сяброўка Марыя. Сферай яе інтарэсаў былі медыцына і спорт. У дзяўчыны быў эмацыйны псіхатып. З такіх дзяцей ніколі не вырастаюць чэмпіёны, паколькі іх прызначэнне ў жыцці — прыгажосць і гармонія адносін. Ім уласцівая павышаная адчувальнасць да ўсяго, што адбываецца навокал, гуманнасць і спагадлівасць. Такі псіхатып падыходзіць для работы з людзьмі ў сферы медыцыны, але не падыходзіць для спорту. Вось толькі паступіць у медыцынскі ўніверсітэт з сярэдняй паспяховасцю было амаль немагчыма. У выніку, скончыўшы ўніверсітэт фізічнай культуры, Марыя стала ўрачом-рэабілітолагам. Цяпер працуе ў буйной прыватнай медыцынскай кампаніі. І паверце, запісацца да яе на прыём вельмі праблематычна...

Спецыяліст па прафарыентацыі часта кажа маладым людзям, што па цячэнні плыве толькі здохлая рыба, таму трэба вучыцца плаваць і супраць яго.Таксама яна гаворыць, што адоранасць забяспечвае магчымасці, а зусім не гарантыю больш высокіх дасягненняў. Ці зможаш ты імі правільна распарадзіцца, залежыць толькі ад цябе...

Новы год Ганна Ісаенка распачынае з новага праекта — запуску анлайн-школы для падлеткаў «Будзь смялейшы! Выбіраем прафесію!» Яна тлумачыць назву так: «Вельмі важна, каб хтосьці ў добразычлівай абстаноўцы падбадзёрыў цябе, усміхнуўся, падтрымаў і некалькі першых крокаў прайшоў з табой разам, узяўшы цябе за руку. У дарослым жыцці вы неаднойчы будзеце паўставаць перад неабходнасцю выбару. З кім жыць? Якія каштоўнасці адстойваць? За што змагацца? Але гэты ваш выбар — першы!»

Надзея НІКАЛАЕВА.

Не вучобай адзінай

У «ЗОРНЫ ПАХОД» З ДАНІНАЙ ПАШАНЫ

У час зімовых канікул з 27 да 29 студзеня ў БДПУ адбудзецца інтэрнацыянальны 56-ты «Зорны паход» па мясцінах баявой і працоўнай славы беларускага народа. Плануецца, што восем атрадаў (больш за 250 студэнтаў і выкладчыкаў) наведаюць у гэтыя дні Дзяржынскі, Крупскі, Любанскі, Слуцкі, Салігорскі і Чэрвеньскі раёны на Міншчыне, а таксама Лідскі і Навагрудскі раёны ў Гродзенскай вобласці.

Падчас паходу студэнты і выкладчыкі правядуць мітынгі і ўскладуць кветкі да брацкіх магіл воінаў і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады вайны, выступяць з канцэртнымі праграмамі ва ўстановах адукацыі рэгіёнаў, правядуць прафарыентацыйныя сустрэчы са старшакласнікамі, арганізуюць майстар-класы і спартыўныя спаборніцтвы.

Ідэя правядзення «зорных паходаў» нарадзілася ў 1965 годзе, калі студэнты тады яшчэ Мінскага педагагічнага інстытута ўзялі ўдзел ва Усесаюзным паходзе моладзі па мясцінах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Яны адправіліся з розных населеных пунктаў краіны, але на карце схема маршруту па форме нагадвала зорку, што і падарыла зімоваму паходу адпаведную назву.

А ў 2015 годзе «зорныя паходы» адзначылі ўжо свой паўвекавы юбілей. За мінулы час мерапрыемства ніколькі не страціла сваёй актуальнасці. З кожным годам расце колькасць атрадаў і ўдзельнікаў, павялічваецца ахоп раёнаў. Адной з новых традыцый стала далучэнне да падзеі замежных грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў БДПУ, бо «Зорны паход» — гэта ўнікальная магчымасць пазнаёміцца з нашай гасціннай краінай, яе гісторыяй і культурай. Сёлета яго ўдзельнікамі стануць студэнты БДПУ з Кітая, Расіі і Туркменістана.

А старт паходу будзе дадзены падчас урачыстага мітынгу, што пройдзе 26 студзеня каля помніка студэнтам і выкладчыкам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ва ўнутраным дворыку БДПУ. Гэта таксама яшчэ адна шматгадовая традыцыя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Маладзёжныя ініцыятывы

Прыдумалі стартап? Давайце яго прасоўваць

На конкурсе інавацыйных праектаў INNSTART BSU каманды студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ прадставілі дзесяць наватарскіх праектаў у розных сферах — інфармацыйных тэхналогій, біятэхналогій, адукацыі, мабільных праграм і гульняў, перапрацоўцы адходаў і іншых. Калектывы-пераможцы атрымалі фінансавае заахвочванне ад вучэбна-навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ», таксама некаторыя праекты былі ўключаны ў акселерацыйную праграму IT-кампаніі KrokIT для аказання кансультацыйнай дапамогі ў іх камерцыялізацыі.

Найлепшым сярод праектаў стаў адукацыйны курс палавога выхавання для бацькоў SexEd трэцякурсніка факультэта сацыякультурных камунікацый Артура КОРБУТА, другакурсніцы факультэта міжнародных адносін Аліны САМОЙЛЕНКІ, а таксама практыкуючага псіхолага, выпускніцы БДПУ імя М. Танка Мілы ВЯДРОВАЙ. Дарэчы, яны сабралі большасць узнагарод ад запрошаных беларускіх прадпрымальнікаў, інвестараў, уладальнікаў паспяховых кампаній, якія былі ў складзе журы конкурсу.

— Актуальнасць праекта ў тым, што на сёння ў многіх краінах, у тым ліку і ў нашай, усё яшчэ адсутнічае прафесійная падрыхтоўка сям'і ў сферы палавога выхавання дзяцей, — падзялілася Міла. — Ідэя ўзнікла з усведамленнем таго, што калі мы нараджаемся, сексуальнасць ужо ў нас ёсць, яна наўпрост звязана з псіхаэмацыянальным развіццём. Амаль кожны з нас памятае хоць бы адзін міф, які нехта навязаў, пра секс ці сексуальнасць або непрыемны выпадак, што адмоўна паўплываў на нас або меў негатыўныя наступствы. На жаль, такая тэма і дагэтуль застаецца табуяванай, з гэтай прычыны з'яўляюцца сорам і негатыўныя ўстаноўкі, а наш праект скіраваны на іх знішчэнне. Мы бачым сваю задачу ў тым, каб прапанаваць усім якасную секс-асвету.

— Цяпер у трэндзе ўсвядомленае бацькоўства, у краіне павышаецца псіхалагічная культура, за апошнія пяць гадоў палепшыўся доступ да такіх ведаў, сексуальнае здароўе стала моднае, — дадала Аліна. — Мы высветлілі, чаго хоча наша мэтавая аўдыторыя — бацькі. Аказалася, яны не валодаюць неабходнымі навыкамі і ведамі пра тое, як наладжваць кантакт з дзіцем, размаўляць аб сітуацыях, звязаных з сексам, што ў саміх дарослых часта ёсць прабелы ў гэтай сферы, яны палохаюцца фізіялагічных змяненняў дзіцяці або вострых пытанняў. Гэтыя ўстаноўкі ідуць з сям'і, таму

Каманда студэнтаў Інстытута бізнесу.

важна іх прапрацоўваць. На сёння ў краіне прапануюцца пераважна толькі індывідуальныя кансультацыі псіхолагаў і сексолагаў. Адметнасцю нашага курса з'яўляецца комплексны падыход у навучанні. Праграма ўключае 12 запісаных лекцый па вывучэнні псіхасексуальнага развіцця, гендарнай ідэнтычнасці, адносін з дзецьмі падчас іх першай закаханасці і іншых пытаннях. Слухачам прапануем выканаць тэарэтычныя і практычныя заданні. Удзельнікі праграмы змогуць абмяняцца думкамі з іншымі бацькамі і псіхолагам, а таксама пры неабходнасці звярнуцца па прафесійную кансультацыю ў чат падтрымкі. Распрацоўвалі курс на аснове матэрыялаў Савета па сексуальнай інфармацыі і асветы ЗША, Шведскай асацыяцыі палавога выхавання, а таксама выкарыстоўвалі розныя замежныя кнігі па тэме.

— З дапамогай гэтага курса бацькі пазбавяцца ад цяжкасцяў у размовах з дзецьмі і будуць самі больш упэўненыя, — кажа Артур. — Наш прадукт будзе актуальны заўсёды, таму што праблемы і пытанні, звязаныя з сексам і сексуальнасцю, прысутнічаюць заўсёды.

Зараз студэнты працуюць над запаўненнем сайта і сацыяльных сетак курса. SexEd будзе размешчаны на навучальнай платформе GetCourse. Запуск пілотнай версіі плануецца ў студзені. Каманда распрацоўшчыкаў атрымала фінансавую падтрымку ад «Унітэхпрама БДУ» і магчымасць удзелу ў акселерацыйнай праграме кампаніі KrokIT.

Каманда студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі распрацавала мабільную праграму Surdo Adapter, скіраваную на дапамогу тым, хто мае парушэнне слыху і праходзіць навучанне ў аўташколе. Гэта прататып платформы па перакладзе галасавых каманд у анімацыю мовай жэстаў. Адзін з распрацоўшчыкаў, Уладзімір УЛЬЯНІЦКІ, лічыць, што дзякуючы іх праекту інструктар па ваджэнні зможа аператыўна даць параду курсанту з асаблівасцямі слыху, што дазволіць знізіць рызыку ўзнікнення ДТЗ. Аналагаў праекта ў краіне пакуль што няма.

— Ідэя ўзнікла, калі знаёмыя работнікі аўташкол падзяліліся існуючай праблемай. На сёння многія навучэнцы і інструктары выкарыстоўваюць мабільную праграму для перакладу вуснай гаворкі ў тэкст, але кіроўцам складана чытаць яго падчас руху, і разуменне інструктара адбываецца з затрымкай. Для таго каб скарыстацца нашай праграмай, апошняму дастаткова запісаць галасавую каманду, якая аўтаматычна пераўтворыцца ў графічны персанаж. Мовай жэстаў, якія будуць змяшчацца ў спецыяльным слоўніку, ён зможа растлумачыць курсанту, што ад яго патрабуецца. Слоўнік складаецца з набору фраз, патрэбных інструктару падчас навучання. Цяпер ён налічвае каля 50 самых неабходных. Напрыклад, «налева», «направа», «газ», «тормаз», «счапленне» і іншых. Перавага інавацыі ў тым, што праграма не патрабуе падключэння да інтэрнэту і будзе працаваць у афлайн-рэжыме. Рэсурс падтрымліваецца на мабільных прыладах з аперацыйнай сістэмай Android.

У найбліжэйшы час каманда распрацоўшчыкаў плануе пашырыць слоўнік, палепшыць распазнаванне гаворкі, пратэсціраваць SurdoAdapter у адной са сталічных аўташкол і — можна выводзіць праект на рынак. Па выніках конкурсу INNSTART BSU хлопцы і дзяўчаты атрымалі магчымасць навучання ў акселерацыйнай праграме стартап-аксілератара KrokIT, а таксама кансультацыі па стварэнні і фінансавым суправаджэнні юрыдычнай асобы ад Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў.

Студэнты Інстытута бізнесу Арцём ЛЕБЕДЗЕЎ і Мікіта АНЕКІЕВІЧ прадставілі платформу для пошуку, выбару і набыцця адзення — Clod. Праект каманды з пяці крэатыўных распрацоўшчыкаў адзначылі інвестары конкурсу, яны сталі ўладальнікамі сертыфіката на 500 рублёў у краму сімволікі «Крама БДУ» ад стартап-цэнтра і атрымалі магчымасць навучання ў акселерацыйнай праграме стартап-акселератара KrokIT. Акрамя таго, калектыў запрошаны для далейшага кансультавання ў прадпрымальніка, ментара, ICO-дарадчыка, бізнес-анёла Антона КУЛІЧЫКІНА, таксама ў іх арсенале аказаліся тры бясплатныя кансультацыі па маркетынгу і прасоўванні ад прадпрымальніка, заснавальніка інвестыцыйных кампаній Дзмітрыя КАЛІНІНА.

Пераможцы Аліна Самойленка, Артур Корбут і Міла Вядрова *(злева направа)*.

— Наша праграма арыентавана на міленіялаў і зумераў, якія нарадзіліся ў лічбавую эпоху і вельмі шмат завісаюць у Instagram, Youtube, TikTok, — расказаў Арцём. — Перад тым як прыступіць да распрацоўкі, мы склалі шэсць гіпотэз, з якіх пацвердзілі толькі дзве, але гэта таксама добры вынік *(усміхаецца)*. Першая — дзяўчатам цікава глядзець, у што апранаюцца іншыя, і яны хочуць ведаць, дзе можна купіць такія ж рэчы, як у іх. Другая — ім падабаецца спалучаць адзенне паміж сабой, яны жадаюць самастойна складаць паўнавартасныя вобразы. Далей важна было прааналізаваць сітуацыю на рынку моды, у свеце ён складае 2,3 трыльёна долараў, фэшн-рытэйл у СНД ацэньваецца ў 250 мільярдаў долараў, пры гэтым доля анлайн-продажу займае прыкладна 20 працэнтаў, а гэта 50 мільярдаў долараў. Таму распрацоўка такой мабільнай праграмы, безумоўна, актуальная ідэя. У ёй карыстальнік можа праглядаць розныя стыльныя вобразы, якія падбярэ сістэма, лайкаць, захоўваць іх у асабістым профілі, а таксама тое самае можна будзе рабіць з вобразамі іншых карыстальнікаў праграмы. І, самае галоўнае, на кожнай рэчы будзе ўказаны брэнд адзення, колькі яно каштуе і дзе яго можна набыць. У нас ёсць канкурэнты, але мы адрозніваемся ад іх тым, што пошук адзення ў нас больш інтэрактыўны, можна ўвесці свае параметры ў профілі, каб сістэма падабрала тыя вобразы, якія падыходзяць менавіта вашай фігуры і звярнуць увагу менавіта на тыя брэнды, што ёсць у нашай краіне, — гэта зробіць шопінг больш зручным.

Каманда плануе зарабляць ад камісіі за пакупку адзення ў праграме (ад 5 да 10 працэнтаў), а таксама ад рэкламы, якую будуць запускаць, калі ў ёй назбіраецца мінімум тысяча пастаянных карыстальнікаў у дзень. Да таго ж, дапаможа супрацоўніцтва з блогерамі, лічаць студэнты, якія будуць складаць сабе вобразы ў Clod і дзяліцца імі з падпісчыкамі ў сацсетках. За кошт гэтага створыцца база пастаянных і лаяльных кліентаў. Распрацоўшчыкі плануюць запусціць праграму ў Play market у красавіку.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота з сайта стартап-цэнтра БДУ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
14 01 2021 г.

У актыўным рытме

МАЛАВЯДОМЫ ВАКІНГ

І такі розны хіп-хоп

Малады спецыяліст, харэограф сучасных танцаў Крысціна КУПЦОВА дакладна вызначылася з прафесіяй яшчэ ў дзяцінстве. Паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на спецыяльнасць «харэаграфічнае мастацтва», а пасля заканчэння працавала ў некалькіх сталічных школах танца. Дзяўчына кажа, што галоўнае ў яе творчым занятку — гэта запал у сэрцы і шчырая любоў да абранай справы.

— Прыкладна ў дзявятым класе школы да мяне прыйшло ўсведамленне, што хачу звязаць сваё жыццё з танцамі. Вядома, калі табе нешта падабаецца, ты шукаеш інфармацыю, глядзіш інтэрв'ю, фільмы кшталту «Крок наперад», розныя навучальныя ўрокі. На мяне ў той час вельмі паўплывала ўкраінскае шоу «Танцуюць усе»: калі ўключала яго па тэлевізары, уяўляла сябе на месцы канкурсантаў, з захапленнем назірала за майстэрствам маладых хлопцаў і дзяўчат. Бацькі да майго выбару паставіліся нейтральна, яны паважалі яго, але мімаходам казалі, што ёсць і іншыя прафесіі, маўляў, танцор — гучыць не вельмі сур'ёзна. Аднак пераканаць у іншым мяне было немагчыма. Памятаю, што перад паступленнем выбірала паміж двума кірункамі — эстрадным і сучасным танцамі — і не пашкадавала, што выбрала другі варыянт.

Крысціна кажа, што вучоба ва ўніверсітэце стала добрым падмуркам для далейшага ўдасканальвання, але астатняе студэнты павінны былі развіваць самі. Таму ў канцы першага курса дзяўчына пайшла займацца сучаснымі танцамі ў адну са сталічных студый.

— Надалей таксама прадоўжыла практыкавацца ў розных школах адпаведнага кірунку. У перыяд навучання на другім курсе знайшла сваё першае рабочае месца ў студыі, выкладала хіп-хоп дзецям па чатыры гадзіны ў тыдзень. Сумяшчала работу, вучобу і паралельна займалася танцамі для сябе. Гэта аказалася даволі лёгка, заняткі праходзілі радасна. Пасля месцы работы мяняліся, імкнулася паспрабаваць сябе ў розных студыях. Калі скончыла ўніверсітэт, па размеркаванні ўладкавалася харэографам у школу мастацтваў у Барысаве, аднак праз некаторы час зразумела, што хачу развівацца ў сталіцы, таму знайшла жаданае месца, дзе працую і дагэтуль, паралельна выкладаю хіп-хоп яшчэ ў дзвюх школах танца і вучуся пазітыўнаму фанкаваму стылю вакінг. Гэты кірунак выкладаецца ў Беларусі толькі другі год і адметны жартоўнай манерай выканання, насычанай мімікай. Цяпер адчуваю сябе вельмі шчаслівай, атрымліваю задавальненне ад кожнага рабочага дня.

Звычайна ў групах па хіп-хопе ў суразмоўніцы трэніруецца па 8—15 дзяцей ва ўзросце ад 7 да 13 гадоў. Заняткі часцей за ўсё праходзяць у вячэрні час, калі хлопчыкі і дзяўчынкі прыходзяць са школы і ў іх ёсць вольныя гадзіны для сваіх захапленняў.

— Падчас першых трэніровак было хваляванне з нагоды, што малыя мяне не будуць слухацца. Але яно сыходзіла па меры таго, як набывала вопыт, да таго ж раілася па пэўных пытаннях з больш вопытнымі калегамі. На сёння амаль усе заняткі па харэаграфіі праходзяць у гульнявой форме, таму малым вельмі цікава іх наведваць. Мы перыядычна рыхтуемся да розных канцэртаў, конкурсаў, спаборніцтваў. Ад дзяцей мне падабаецца адкрытасць, калі ім нешта не даспадобы, яны абавязкова гэта пакажуць, хутка адрэагуюць зваротнай сувяззю. Заўважала, што важна прыходзіць да малых у добрым настроі, а ён і будзе добры, калі хадзіць на любімую работу, бачыць тых, хто табе рады і гэта ўзаемна. Вядома, бываюць цяжкія дні, але стараюся на трэніроўках тое не паказваць, бо дзеці вельмі адчувальныя: калі ты разгубленая альбо сумная, яны ўсё пераймаюць на сябе. Таму важна даваць ім пазітыўныя, правільныя эмоцыі.

Хіп-хоп бывае розны. Яго рытмы — яркія, выразныя, выклікаюць жаданне не сядзець на месцы, а рухі спружыністыя. 22-гадовая дзяўчына прызнаецца, што нягледзячы на асаблівую любоў да такога танца, прывязваць сябе да пэўнага стылю не плануе. Крысціна не выключае, што праз некалькі гадоў стане выкладаць штосьці іншае.

— Для многіх танец — гэта спосаб самавыяўлення, імкненне паказаць навакольным, які я, якім бачу свет і да чаго імкнуся. Кожны з нас унікальны, а таму і танец яго будзе асаблівы. Калі я танцую, адчуваю эмоцыі, якія складана апісаць, але яны мне адназначна падабаюцца. Знаходжуся ў адзінстве з музыкай, рухамі, у асаблівым энергетычным патоку. А вось думак падчас заняткаў няма ніякіх, цалкам засяроджваюся на сваіх адчуваннях. Дарэчы, часам задумваюся над тым, каб паўдзельнічаць у пэўных танцавальных шоу. Гэта карысны вопыт, які, упэўнена, дае шмат чаго патрэбнага для развіцця ў прафесіі. Пакуль назапашваю вопыт і выношваю грандыёзныя планы на будучыню.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота з асабістага архіва гераіні.

Хто, калі не мы?

ПОЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ МАЛАДЗЁЖНЫХ ПАСЛОЎ

Першакурсніца юрыдычнага факультэта БДУ Стэфанія-Віталія ВІННІЧАК стала маладзёжным паслом Мэт устойлівага развіцця Беларусі. Дзяўчына перамагла ў конкурсе «Маладзёжныя паслы Мэт устойлівага развіцця — будучыня планеты ў нашых руках», які завяршыўся ў снежні мінулага года.

Падчас спаборніцтваў студэнтка прадставіла сваю праграму па рэалізацыі 16-й мэты «Мір, правасуддзе і эфектыўныя інстытуты». Стэфанія-Віталія Віннічак прапануе стварыць інтэрактыўную кансультацыйную пляцоўку прававой падтрымкі маладзёжных стартап-праектаў і аказваць дапамогу ў юрыдычным афармленні іх дакументаў на базе Цэнтра ўстойлівага развіцця БДУ. Таксама яе праграма ўключае арганізацыю дзён прававога інфармавання ў школах і круглых сталоў на юрыдычным факультэце з запрашэннем экспертаў у галіне Мэт устойлівага развіцця.

Усяго па выніках конкурсу былі абраныя 17 маладзёжных паслоў. Іх дзейнасць будзе скіравана на папулярызацыю Мэт устойлівага развіцця сярод моладзі, прасоўванне сярод студэнтаў ведаў, ідэй і прынцыпаў устойлівага развіцця.

Размова ідзе пра набор мэт для будучага міжнароднага супрацоўніцтва, якія рэалізуюцца пад кіраўніцтвам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Яны арыентаваны на забеспячэнне прагрэсу ў галіне эканамічнага росту, сацыяльнай інтэграцыі і аховы навакольнага асяроддзя.

У 2015 годзе Павестку ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года прынялі 193 краіны — члены ААН.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ФОРМА І ДЫСЦЫПЛІНА ПАГРАНІЧНІКА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Акрамя павышанага вывучэння матэматыкі і англійскай мовы, ваенны клас вылучаецца ўвядзеннем у праграму двух дадатковых прадметаў: этыкі і гуртка памежніка. Першы неабходны, каб ужо зараз «курсанты» навучыліся асновам добрага тону і правілам этыкету, бо кожны ваенны чалавек павінен быць эталонам ва ўсіх сферах. Што датычыцца профільнага гуртка, дык для яго спецыяльна запрасілі педагога з ваеннай адукацыяй. Ён навучае ўсім навыкам і асновам армейскага жыцця. А ў пазашкольны час кіраўніцтва актыўна супрацоўнічае з Інстытутам пагранічнай службы, дзякуючы чаму вучні маюць магчымасць наведваць усе іх мерапрыемствы. На адным з такіх будучым памежнікам выдалі іх першую форму і дакументы, якія дазваляюць яе насіць, — дадала Таццяна Аляксандраўна.

Атрымаўшы інфармацыю ад адміністрацыі школы, мы вырашылі пагутарыць з вучнямі ваеннага класа і даведацца пра іх думкі і ўражанні ад вучобы.

— Да нядаўняга часу я жыў у Маскве, але па збегу абставін мая сям'я пераехала ў Мінск, — распавядае Фёдар Дунаў. — І я адразу ж стаў шукаць розныя навучальныя ўстановы з ваеннай скіраванасцю, прыдатныя мне па ўзросце, так і трапіў на сайт 206-й школы. Паколькі пагранічны кірунак мяне заўсёды вабіў больш за астатнія, я падрабязна даведаўся аб правілах прыёму ў ваенны клас і расказаў пра яго маме. Бацькі падтрымалі мяне, і цяпер я вучуся тут і ні разу аб гэтым не пашкадаваў. Хоць у нашым класе і адчуваецца ваенная дысцыпліна, мы з радасцю прымаем удзел у творчым жыцці школы і стараемся паказваць усім прыклад і ў плане вучобы. Я крок за крокам іду да сваёй мэты і спадзяюся стаць сапраўдным пагранічнікам.

Наступны наш суразмоўнік, Андрэй Блазуцкі, прызнаецца, што раней яго цікавіў іншы ваенны кірунак, але з-за пэўных момантаў ён зразумеў, што не зможа яго асвоіць, і вырашыў паспрабаваць сябе ў іншай спецыяльнасці.

— Быць пагранічнікам — гэта вялікая адказнасць. Калі я паступіў сюды, усе мае сябры і блізкія вельмі ганарыліся мной. Шчыра кажучы, так класна насіць не школьную форму, а ваенную, адразу адчуваеш сябе асаблівым. Але разам з гэтым на цябе кладзецца мноства абавязкаў, бо яна выдаецца не кожнаму, а толькі тым, хто заслужыў. Надзеўшы яе, ты павінен быць прыкладам для астатніх. Пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы хацеў бы служыць на заставе або застацца ў інстытуце.

Хоць і існуе стэрэатып, што ваенная справа з'яўляецца мужчынскай тэрыторыяй, роўна палова курсантаў інавацыйнага класа — дзяўчаты, якія зусім не горш спраўляюцца з павышанымі патрабаваннямі. Адной з такіх з'яўляецца Ліна Батура.

— Мой дзядуля — вайсковец, ён заўсёды быў і застаецца прыкладам для мяне. Вядома ж, хацеў, каб я пайшла па яго слядах, і калі мой класны кіраўнік расказала, што ў Мінску адкрыўся першы профільны клас з памежнай скіраванасцю, я ў той жа дзень паехала і падала дакументы, бо заўсёды марыла працаваць на мытні ў аэрапорце. Вядома, бацькі спачатку не асабліва прымалі мой выбар, яны хацелі, каб я развівалася ў матэматычным кірунку, але, выслухаўшы мае аргументы, змірыліся. Дарэчы, наша форма — яна вельмі прыгожая і падабаецца мне нашмат больш за школьную. *(Смяецца.)*

Ангеліна НОВІКАВА,
студэнтка IV курса
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры
і мастацтваў.
Фота дадзена СШ № 206
г. Мінска.

Роўна палова курсантаў інавацыйнага класа — дзяўчаты, якія зусім не горш спраўляюцца з павышанымі патрабаваннямі.

Пары на парах

Сямейная вячэра па-студэнцку,

або Як гэта — знайсці адно аднаго

Арцём і Анастасія КАВАЛЕЎСКІЯ — найлепшая студэнцкая сям'я па выніках рэспубліканскага конкурсу «Шчаслівыя разам». Але такімі яны з'яўляюцца не толькі ў рамках праекта, бо разам ужо пяць гадоў, тры з якіх — у афіцыйным шлюбе. Суразмоўнікі прызнаюцца: з гадамі іх каханне становіцца ўсё мацнейшым, і сакрэту ў гэтым ніякага няма — трэба вельмі паважаць адно аднаго, мець агульныя мэты і заўсёды самаўдасканальвацца.

— Я па жыцці актыўны і адказны хлопец, — кажа дваццацічатырохгадовы Арцём. — Вучуся на чацвёртым курсе лячэбнага факультэта Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта, з'яўляюся намеснікам старшыні прафкама студэнтаў нашай ВНУ, акрамя таго, працую фельчарам на хуткай дапамозе. Агульны медыцынскі стаж — шэсць гадоў. Сам родам з Магілёва, Насця — з Рагачова. Пазнаёміліся на трэніроўцы па баскетболе. Тады разам вучыліся ў Аршанскім дзяржаўным медыцынскім каледжы. Яна была на першым курсе, я на трэцім. Мне заўсёды здавалася, што такі спорт — пераважна для хлопцаў, таму было нязвыкла бачыць там дзяўчыну. Пачаў аказваць ёй знакі ўвагі, аднак спачатку яна іх ігнаравала. А праз некаторы час неяк выбіраў аўсяныя крупы ў краме (вырашыў перайсці на правільнае харчаванне), хтосьці ззаду падышоў і сказаў: бяры тую, што з абрыкосамі, яна вельмі смачная. Азірнуўся — а гэта Насця. Падумаў, што марнаваць час не трэба, узяў ініцыятыву на сябе: правёў яе да інтэрната і данёс торбы, запрасіў на гарбату з торцікам. І так крок за крокам зблізіліся, паколькі бачыліся і на вучобе, і ў інтэрнаце.

«Наконт размеркавання сямейнага бюджэту ў нас усё проста. З самага пачатку стасункаў нічога не дзялілі на «тваё-маё».

— Так, я доўга супраціўлялася заляцанням Арцёма, хоць ён адразу вельмі спадабаўся: спартыўны, рашучы, харызматычны. Прайшоў пэўны час — і закахалася, пачалі сустракацца, — расказвае дзяўчына. Зараз Насця вучыцца на трэцім курсе факультэта ветэрынарнай медыцыны Віцебскай дзяржаўнай ветакадэміі.

— Мне прыемна, што муж — хлопец практычны, але калі трэба, можа быць вельмі рамантычным, — прызнаецца яна. — Калі адзначаем маленькія і вялікія значныя для нас даты, заўсёды прыемна мяне здзіўляе. Памятаю, прыязджаю з Рагачова ў Оршу, а мяне ўжо чакае букет прыгожых руж і смачная вячэра. Або сустрэча з ім на вакзале і маленькі падарунак.

— Насця вельмі любіць салодкае, таму імкнуся штодзень прыносіць дадому ласункі, — дадае Арцём.

Падчас вучобы ў Оршы пара жыла разам у інтэрнаце медкаледжа, ужо тады вырашылі рабіць усё разам, весці агульны бюджэт, бо ведалі: іх намеры ў адносінах адно да аднаго — сур'ёзныя.

— Я праз два месяцы пазнаёміла Арцёма са сваімі бацькамі, — падзялілася Насця. — Памятаю, на Новы год прывезла яго дадому, там былі ўсе мае сваякі і я афіцыйна прадставіла яго як хлопца. А пасля, у лютым на зімовых канікулах, ён мяне павёз да сваіх. Узаконіць нашы стасункі не было спантанным рашэннем. І я пэўны час сумнявалася: ці не рана мне выходзіць замуж, бо ўсё ж такі сустракаліся на той момант толькі паўтара года. Але Арцём сказаў: я цябе кахаю і хачу далей быць з табой, таму якая мне розніца, ажэнімся мы зараз, праз два гады або праз дзесяць, я ўсё роўна хачу быць з табой заўсёды. Цяпер у афіцыйным шлюбе адчуваю сябе больш абароненай і лічу, што для будучых дзяцей так будзе лепш. Увогуле Арцём скончыў каледж раней, чым я, на два гады, і паехаў працаваць і атрымліваць вышэйшую адукацыю ў Віцебск. Аднойчы прыехала да яго ў госці, мы пайшлі прагуляцца. Надвор'е было не вельмі добрае: дзьмуў вецер і ішоў дождж. Праходзілі па месце, дзе вісела шмат замочкаў закаханых пар, і я падумала: трэба і нам павесіць, — і тут ён дастае замочак. Здзівілася, што так супала. І раптам пачула, як людзі вакол пачалі пляскаць у далоні. Азірнулася — Арцём стаў на калена з пярсцёнкам і са словамі: «Цяпер ты абавязана выйсці за мяне замуж!»

— Так, я доўга супраціўлялася заляцанням Арцёма, хоць ён адразу вельмі спадабаўся: спартыўны, рашучы, харызматычны. Прайшоў пэўны час — і закахалася, пачалі сустракацца, — расказвае дзяўчына. Зараз Насця вучыцца на трэцім курсе факультэта ветэрынарнай медыцыны Віцебскай дзяржаўнай ветакадэміі.

— Мне прыемна, што муж — хлопец практычны, але калі трэба, можа быць вельмі рамантычным, — прызнаецца яна. — Калі адзначаем маленькія і вялікія значныя для нас даты, заўсёды прыемна мяне здзіўляе. Памятаю, прыязджаю з Рагачова ў Оршу, а мяне ўжо чакае букет прыгожых руж і смачная вячэра. Або сустрэча з ім на вакзале і маленькі падарунак.

— Насця вельмі любіць салодкае, таму імкнуся штодзень прыносіць дадому ласункі, — дадае Арцём.

— Дарэчы, вяселле адсвяткавалі ў прыгожую дату: 07.07.2017, каб дакладна пра яе не забыць *(усміхаецца Арцём)*, але я і так усё памятаю! Ідэальнага моманту і ўзросту для ўступлення ў шлюб няма. Я сустрэў свайго чалавека і вырашыў не цягнуць. Бацькі таксама падтрымалі ў намерах ажаніцца. У шлюбе наша стаўленне адно да аднаго амаль не змянілася, хіба што, вырас узровень даверу. Пры гэтым у нас абсалютна розныя характары, можа, як кажуць, «мінус на мінус дае плюс», таму людзі і прыцягваюцца? Мы саступаем адно аднаму, бо ў адносінах важны кампраміс.

Маладая пара зараз жыве ў інтэрнаце ў сямейным блоку, які выдзеліў ім медуніверсітэт: з асобным санвузлом, кухняй і прасторным пакоем. Графікі ў сужэнцаў загружаныя: днём яны вучацца, а па начах працуюць, таму іншым часам бачыцца ўдаецца рэдка.

— У быту дапамагаем адно аднаму, — расказвае Арцём. — Гатаванне, уборка — не праблема, калі бачу, што каханая занятая або стамілася пасля работы, магу сам нешта прыдумаць. Аднак увогуле лічу, што за дзяўчынай — побыт, стварэнне ўтульнага дамашняга ачага, дамашнія заняткі. А за мной — больш складаныя, сур'ёзныя пытанні. Зразумела, Насцю заўсёды выслухаю, аднак апошняе слова — за мной. Наконт размеркавання сямейнага бюджэту ў нас усё проста. З самага пачатку стасункаў нічога не дзялілі на «тваё-маё». Калі адзін заставаўся без грошай, другі абавязкова выратоўваў. Гаворым, каму што трэба купіць, і разам набываем гэта. Расплаціцца на касе ў харчовай краме, аплаціць «камуналку», набыць абутак ці адзенне, памяняць гуму на машыне можа кожны з нас у залежнасці ад таго, у каго стыпендыя бліжэй або зарплата «цалейшая». Частку заробку атрымліваецца адкладваць на значныя пакупкі, напрыклад, год таму набылі машыну.

— За што шануеце адно аднаго? — пытаюся ў суразмоўцаў.

— Мне ў Насці адразу спадабалася празмерная дабрыня, гэта адна з самых галоўных яе якасцяў. Яна вельмі любіць жывёл, заўсёды ім дапамагае, відавочна, што адчувае сябе побач з імі нашмат больш шчаслівай. Да таго ж жонка смачна гатуе — шлях да майго сэрца праз страўнік яна дакладна праклала! У пачатку нашых адносін я важыў значна менш, чым цяпер, а ўсё таму, што каханая сама есць, як верабей, а мне прыходзіцца даядаць *(усміхаецца)*. А яшчэ — яна гаспадарлівая, шчырая. У нас ёсць кот Сямён, якому зараз пяць месяцаў, Насця яму пастаянна спявае калыханкі, носіць на ручках, корміць — адразу відаць, якой будзе мамай. Мне падабаецца выраз «муж галава, а жонка — шыя» — гэта пра нас. Бывае, іншым часам на мяне за штосьці крыўдзіцца і не кажа, у чым справа, аднак лічу, што дробязі не вартыя таго, каб доўга дзьмуцца і чакаць, хто першы забудзе пра свой гонар. А яшчэ мне здаецца, яна вельмі раўнівая.

— Арцём вельмі харызматычны, а дзяўчаты гэта любяць, тым больш ён працуе і вучыцца амаль у жаночым калектыве. Зразумела, не хачу яго ні з кім дзяліць. Мужа цаню за тое, што ён вельмі мэтанакіраваны і заўсёды дамагаецца таго, чаго хоча. Ведаю, што за спінай такога мужчыны буду як за каменнай сцяной, і нашы дзеці ў будучыні — таксама. Вырашыць любое пытанне, ніколі не здаецца і не апускае рукі. Ён — чалавек справы, а не пустых слоў. А яшчэ Арцём вельмі клапатлівы і пяшчотны.

— Як лічыце, што робіць шлюб мацнейшым?

— Па-першае, гэта давер, паразуменне і раўнапраўе, — упэўнены хлопец. — Важна заўсёды здзіўляць адно аднаго, рабіць сюрпрызы і не ператвараць дробязі ў вялікія канфлікты. У сям'і важна быць на адной хвалі, у чым нам у першую чаргу дапамагае прафесія: заўсёды ёсць што абмеркаваць.

— Мы падтрымліваем адно аднаго ў цяжкіх сітуацыях, — дадае Насця. — Калі здараюцца праблемы на рабоце ці ў сям'і, ніхто не скажа: гэта мяне не датычыцца, наадварот, заўсёды дапаможам адно аднаму і словам, і справай.

Пара падзялілася, што адпачываюць яны звычайна разам, любяць хадзіць у госці і запрашаць да сябе сяброў. Да таго ж не супраць паглядзець серыялы.

— Вольнага часу ў нас звычайна няшмат, таму часта хочацца проста расслабіцца. Для прагляду звычайна выбіраем што-небудзь лёгкае, напрыклад, гумарыстычную перадачу, каб разгрузіць галаву, адпачыць ад работы, — дзеліцца Насця. — Заказваем піцу або сушы і атрымліваем асалоду адно ад аднаго. Але калі час дазваляе, не сядзім на месцы: без нас не абыходзіцца ні адзін турзлёт, конкурс або спаборніцтвы.

«Ведаю, што за спінай такога мужчыны буду як за каменнай сцяной, і нашы дзеці ў будучыні — таксама».

— Вось і сёлета не прайшлі міма рэспубліканскага конкурсу «Шчаслівыя разам», — дадае Арцём. — Мы ведалі аб яго існаванні, хацелі ўзяць у ім удзел раней, але па ўмовах зрабіць гэта маглі толькі пары, дзе абодва — студэнты медуніверсітэта. А ўжо ў бягучым годзе знялі такое абмежаванне, і мы ўзрадаваліся. Каб стаць найлепшымі, нам і яшчэ сямі парам трэба было прайсці выпрабаванні па планаванні бюджэту, гатаванні, сервіроўцы стала і іншым. Два гады таму я наведваў такі конкурс у складзе групы падтрымкі, таму прыкладна разумеў, чаго нам чакаць. Калі прыйшоў час ехаць, папярэдзіў усіх — мы накіроўваемся толькі за перамогай. Месяц быў на падрыхтоўку, усе этапы праходзілі на працягу трох дзён. У першы для нас была арганізаваная спартландыя, а пасля хлопцы павінны былі зрабіць арганайзеры для ключоў, а дзяўчаты — прыгатаваць сямейную вячэру. Па ўмовах конкурсу трэба было купіць прадукты на 30 рублёў і як мага хутчэй прынесці іх каханай. Я справіўся за восем хвілін, тым самым паказаўшы найлепшы вынік. Сюрпрызам стала тое, што такое заданне ўсе выконвалі адначасова, аднак мы не разгубіліся: не ў першы ж раз гатуем. Пасля — час сервіроўкі, тут рабіў усё сам, і для мяне гэты этап стаў адным з самых павучальных і карысных, ён дакладна спатрэбіцца ў паўсядзённасці. У канцы дня наведвалі закрыты спектакль у тэатры, вельмі спадабалася. А на трэці дзень выпрабаванняў мы паказвалі візітоўку і творчы нумар: я іграў на гітары і спяваў песню, жонка была на бэк-вакале, таксама дапамагалі сябры — Ілья і Ганна Рубцовы — з флейтай і баянам.

Мэты на будучыню ў пары дакладна ёсць. Спачатку, кажуць сужэнцы, трэба скончыць універсітэт, што яны зробяць у адзін год, а пазней, хутчэй за ўсё, іх чакае пераезд у Оршу ці Магілёў. «Да дыплома засталося менш за два гады. Насця, можа, да гэтага часу сыдзе ў дэкрэтны адпачынак. Асабіста я ўжо гатовы стаць бацькам», — падзяліўся Арцём.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота з асабістага архіва герояў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Республиканского унитарного предприятия «Минскавтодор-Центр» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ КОНТОРЫ

(линейной дорожной дистанции № 662 филиала «ДЭУ № 66»)
с инвентарным номером 633/D-5080 общей площадью 55,9 кв. м, расположенного в здании блокированного жилого дома с инвентарным номером 633/С-6694 по адресу: Минская область, Мядельский район, г.п. Свирь, ул. Советская, 14-4 (далее – Объект).

Начальная цена (без НДС) – 29,00 бел. руб.
Цена равна 1 (одной) базовой величине. Задаток – **29,00 бел. руб.**

Условия продажи:
- осуществление покупателем предпринимательской деятельности в течение одного года, начиная не позднее двух лет с даты государственной регистрации договора купли-продажи, с использованием приобретенного недвижимого имущества;
- реконструкция под жилые помещения в течение двух лет или перевод в жилые помещения в течение одного года без реконструкции с даты государственной регистрации договора купли-продажи.

Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 12.11.2019, 24.06.2020, 21.07.2020, 18.08.2020.

Аукцион состоится **26.01.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.01.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНП 190638747

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

Лот	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 А5; год выпуска – 2009; регистрационный знак – АІ 4937-5; кузов (VIN) № – Y3M6303A590001285	10 008,00	1000,80	500,40
2	Грузовой бортовой МАЗ 53371; год выпуска – 1996; регистрационный знак – АІ 6711-5; кузов (VIN) № – Y3M533710T0016457	1 872,00	187,20	93,60
3	Грузовой специальный самосвал GAZ-SAZ 3507; год выпуска – 1991; регистрационный знак – 6189 АР-5; кузов (VIN) № – XTH330720M1438750	1 152,00	115,20	57,60
4	Легковой седан OPEL OMEGA; год выпуска – 1998; регистрационный знак – 6481 ОАА; кузов (VIN) № – W0L0VBM69W1022496	864,00	86,40	43,20
5	Прицеп тракторный ПСЕ; год выпуска – 1991; регистрационный номер – БН; кузов (VIN) № – БН	446,40	44,64	22,32
6	Прицеп тракторный ПСЕФ-12 БС; год выпуска – 1993; регистрационный знак – БН; кузов (VIN) № – БН	720,00	72,00	36,00
7	Прицеп тракторный 2ПТС-4; год выпуска – 2000; регистрационный знак ОВ-5 2380; кузов (VIN) № – БН	1 224,00	122,40	61,20
8	Мотоцикл ММВЗ 3.1134 Лесник; год выпуска – 2007; регистрационный знак – 1734 АА-5; кузов (VIN) № – 70000260	720,00	72,00	36,00
9	Погрузчик ковшовый Сталева Воля; год выпуска – 1997; регистрационный знак – нет; кузов (VIN) № – БН	15 624,00	1 562,40	781,20
10	Вилочный электропогрузчик Balkancar EB717; год выпуска – 1995; регистрационный знак – БН; кузов (VIN) № – БН	1 596,00	159,60	79,80

Лоты №№ 1–10 расположены по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, вблизи п. Чисть

В отношении лотов 1–9 проводятся четвертые повторные торги. Стоимость с учетом снижения на 40 %. В отношении лота 10 проводятся третьи повторные торги. Стоимость с учетом снижения на 30 %.

Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 121 от 24.06.2020 стр. 4, № 171 (29285) от 03.09.2020 стр. 14, № 204 от 20.10.2020 стр. 11 в отношении лотов 1–10 и № 230 (29344) от 25.11.2020 стр. 6 в отношении лотов 1-9. На сайте https://bankrot.gov.by извещение № 00053476, № 00056359, № 00058089 в отношении лотов 1–10 и № 00058089 в отношении лотов 1–9

Лот	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Задаток, бел. руб	Шаг аукциона, бел. руб
11	Машина разрывная МР-500 (20-500) кН	3 960,00	396,00	198,00
12	Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 630/С-62355, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад нефтепродуктов (с составными частями и принадлежностями). Полный перечень см. на сайте https://orgtorg.by	63 732,00	6373,20	3186,60

Лот № 11 расположен по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 1, вблизи п. Чисть
Лот № 12 расположен по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, 1

В отношении вышеуказанного имущества проводятся пятые повторные торги. Стоимость с учетом снижения на 50 %.

Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 95 от 19.05.2020 стр. 14, № 140 от 22.07.2020 стр. 4, № 171 (29285) от 03.09.2020 стр. 14, № 204 от 20.10.2020 стр. 11, № 230 (29344) от 25.11.2020 стр. 6. На сайте https://bankrot.gov.by/ извещение № 00054671, 00052430, № 00056359, № 00058089

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА И КРИТЕРИИ ВЫЯВЛЕНИЯ ПОБЕДИТЕЛЯ

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Аукцион проводится до наиболее высокой цены предмета аукциона. Аукционист объявляет участника, предложившего более высокую цену за предмет аукциона, трижды повторяет последнюю цену и при отсутствии надбавок объявляет о том, что имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Данный участник получает статус «Претендент на покупку» и на него распространяются правила и условия, установленные законодательством для победителя аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Начало приема заявлений в 10.00 14.01.2021 г.
Окончание приема заявлений в 16.00 27.01.2021г.
по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Аукцион по лотам состоится 28.01.2021 в 12.00
(регистрация участников с 11.30 до 12.00)
по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом __.__.2021 г.»

Срок внесения задатка: с 10.00 14.01.2021 г. по 16.00 27.01.2021 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами аукциона. Контактное лицо для осмотра предметов: 8 029 303 18 05 (Новоселов Дмитрий Викторович).

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону 8 (029) 171 09 46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

Дополнительная информация по лотам 1–11 – по телефону +375 29 304-25-60 (Андрей), по лоту 12 – по телефону +375 29 308-27-62 (Екатерина).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Снятие с гос. учета предмета торгов осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет.

Государственная регистрация договора купли-продажи объектов недвижимости, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121: ☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by**
Продавец	**ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-консультант» ☎ +375 (29) 698-51-76, +375 (29) 502-77-77, +375 (29) 392-89-06, +375 (17) 395-58-13**

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 17 февраля 2021 г. в 11.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания магазина, принадлежащего Гомельскому областному потребительскому обществу на праве собственности

Состав лота № 1:

Здание магазина, инв. № 334/С-12479. Адрес: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 23. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное строение, 1948 года постройки. Общая площадь 150,4 кв. м. Составные части и принадлежности: уборная, ворота, ограждение

Начальная цена лота: 28 440,00 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
Задаток: 2 440,00 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок *для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью* ***0,0402 га*** *с кадастровым номером* ***322855100001001388.*** *Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 16 февраля 2021 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 10.00 до 11.00 **17 февраля 2021 г.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 14 января 2021 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47.
Сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by
Продавец: Лельчицкий филиал Гомельского облпотребобщества, Гомельская область, г. п. Лельчицы, ул. Советская, 64, тел.: 8 (02356) 2-03-08, 2-07-70, 8 (029) 140-80-66

Свидетельство о государственной регистрации Частного торгового унитарного предприятия «Форалл» УНП 191096367 **считать недействительным в связи с утерей.**

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» 15 февраля 2021 года в 11.00 ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена продажи, бел. руб., без НДС	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
1	Трансформатор ТМФ 400/10-74 У1 с инвентарным номером 1573 (мощность 400кВа, напряжение 10/0,4, размер 1850х1060х1800, масса 1400 кг, год выпуска – 1986)	2835,00	Могилевская область, Бобруйский р-н, южнее д. Ковали, в р-не ст. Телуша	283,50
2	Силовой шкаф с инвентарным номером 4071 (размер 2х1065х1340х1800, масса 950 кг, 2 секции: секция ВН (высокого напряжения) выключатель нагрузки ВНП-10 с ручным приводом – 1 шт., секция НН (низкого напряжения) автоматический выключатель ВА 57-35Ін250А – 1 шт., автоматический выключатель ВА 57-39Ін630А – 1 шт., год выпуска – 1986)	1680,00		168,00
	Всего	4515,00		451,50

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **15 февраля 2021 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г.

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **12.02.2021 г.,** время: **17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено на сайте ОАО «ДСТ № 3».

Аўтар разважае пра сябе так: «Хто я? Чалавек, які любіць мастацтва. Назіральнік. Літаратурны гурман. Калекцыянер водараў, адценняў, эмоцый, вобразаў. Пішу карціны. Мару не толькі выдаць зборнік апавяданняў, але і атрымаць зваротную сувязь, крытыку. Хочацца, каб дасылалі водгукі на мае творы. Дзе вы?» Мо чытачы «Чырвонкі». Чырвонай змены» адгукнуцца? На адрас часопіса «Маладосць», калі ласка.

Вольга РОПАТ

ГОРАД О.

ГІСТОРЫЯ АДНАГО СМАЧНАГА ГОРАДА

(Урывак)

Усявышні пстрыкнуў двума пальцамі левай рукі, і марыянеткі з'явіліся. Усявышні — не фокуснік і не рэжысёр.

Пустэча. Толькі зямля, неба і рака. Першым Горад агледзеў Пісьменнік у цёмна-вішнёвым паліто. Сцягнуў скураныя пальчаткі. Паклаў іх у заплечнік. Задумена-ўзвышана паглядзеў удалечыню (успамінаем штампаваныя выразы твараў кінагерояў, асабліва воінаў, рыцараў, цароў). Каля Пісьменніка Усявышні паставіў высокага і тонкага, як спічка, Архітэктара, а таксама маленькага, «ёмістага» Скульптара з ружовымі шчокамі-яблычкамі. Архітэктар гідліва паглядзеў на першага госця. Скульптар маўчаў і сачыў за Архітэктарам. Ніхто з прыстуных не заўважыў, як падышоў Мастак, твар якога прыкрываў ад моцнага ветру лімонны шалік — хацеў дацягнуцца «пушыстасцю» да берэта-воблачка. Мастак паглядзеў на творцаў. Паглядзеў на неба. І твар скрывіўся. На карункавым паветраным шары прыляцелі Парфумер і Музыка. Танклявы, з курчавымі попельнымі валасамі, Музыка размахваў рукамі, быццам лашчыў фартэпіяна. Парфумер у бэзавай кашулі, з маленькай кішэнькі якой выглядвала ружа, назіраў за плаўнымі рухамі знаёмага. Застаўся апошні кадр. Выскачыў з лодкі Фатограф у крэмавым капелюшы і пабег у бок кампаніі.

Прагучала музыка. Павольна падплыло мяккае, быццам напоўненае кандытарскім крэмам, воблака. Адчынілася дзверка, і танклявая лапка апусціла скрутак з заданнем. Белы скрутак, які быў у вышыню з 16-павярховы дом, паветраным змеем паляцеў уніз. Паскакалі літары колеру салодкага апельсіна:

«Стварыць вобраз горада»

— Значыць, мой шкляны дом будзе знаходзіцца вось тут! — папярэдзіў Архітэктар, паказаўшы кашчавым пальцам на цэнтр Горада.

Ніхто яму пярэчыць не стаў. Можа, з-за таго, што ў ім адчуваліся веліч і моц, а страчваць энергію, хвалю натхнення, творчы запал не хацелася. Бо ўсё толькі пачынаецца.

Кампанія рассыпалася, як дражэ «Скітлс». Усявышні сядзеў у воблаку колеру марской пены і назіраў за творцамі — кожную гадзіну выглядваў з круглага акна кандытарскага воблачка.

Пісьменнік успрыняў заданне літаральна: пачаў гуляцца са словамі «вобраз горада». Які наш Горад?.. Пісьменнік сеў на зямлю і дастаў блакнот з ручкай.

Ровар
Зара
Гора
Вада

Ода
Бра
Раб
Ваза
Дар

Горад галосных... Горад, у якім усё павінна спяваць! Горад свабоды!

Ён падняў галаву, і ў ягоных вачах адлюстраваліся бірузовае неба і кавалачак масленага сонейка.

Пісака, ідзі сюды! Дапамагаць будзеш! — крыкнуў Архітэктар.

— Не, шаноўны!

— Ты ўсё роўна нічога не робіш! Я не бачу тваю работу!

— Ты яе пакуль і не ўбачыш! Думаць таксама балюча...

Архітэктар прамаўчаў, але позірк быў такі, што, здавалася, працяў Пісьменніка. «Усе думаюць! Толькі хтосьці яшчэ і робіць! І робіць для людзей!»

Адчынілася ў воблаку дзверка. Танклявая лапка скінула лесвіцу. Па заказе Архітэктара маленькія жывёлінкі спускалі шкляныя каляровыя прамавугольнікі — сцены будучага дома.

Натхніўшыся гульнёй слоў і літар, Пісьменнік пайшоў да Музыкі. Той сядзеў каля ракі ды слухаў яе.

— Ну, як ты? Можа, мелодыя з'явілася? — з надзеяй спытаў Пісьменнік.

— Ведаеш, штосьці не магу злавіць яе... Слухаю раку. Можа, яна падкажа... — з кожным словам надзея Музыкі знікала.

— Можа, і так... Хто яго ведае?.. Мне, падаецца, удалося разгадаць... Наш Горад свабодны! Ты толькі прыслухайся: «вооообрааааз гоооораааадааа» (павярнуў галаву ў іншы бок і быццам бы на сцэне яшчэ раз вымавіў) «вооообраз гооорада»... (паглядзеў на Музыку).

— Ты ўспрыняў заданне Усявышняга літаральна. Але ў гэтым ёсць цікавая ідэя. Колькі выразных «о» і задуменных «а»!

Пісьменнік пайшоў далей. Калі ідэя (Муза/думка — гаварыце, як вам больш падабаецца) прыйшла, то лепш пакінуць творчую асобу.

Парфумер тым часам перабіраў пукатыя шкляныя бутэлечкі з падрыхтаванымі пахамі. Адна кропелька ўпала на бела-персікавую з карункамі хустачку — узмах... Зморшчыўся. «Не, не тое...». Пальцы хутка забегалі па бутэльках. «Не, не... не падыходзіць... Груба... Салодка... Нейкай вішняй пахне...»

— Знайшоў водар Горада? — яшчэ ўдалечыні пачаў пытацца Пісьменнік, быццам яны суседзі па дамах.

— Усё не тое! Ты ўяўляеш? Са мной такога ніколі не было! Каб Я сядзеў гадзінамі ды мучыўся?

— Дык які водар табе трэба? Што падабаецца?

— Не ведаю. У маім куфры (жэстам падзывае, каб знаёмы паглядзеў на ягоны скарб) 555 пахаў. І ніводны не асацыюецца з гэтым Горадам!

— Значыць, варта прыдумаць яшчэ адзін. Асаблівы. Думаю, мне ўдалося раскрыць сакрэт Горада. Ён СВАБОДНЫ! Ад усяго! Колькі тут...

— У кожнага свая свабода. Свабо-да-а-а-а... Свабо-да-а-а-а... О! У мяне няма паху свабоды!

Парфумер рэзка адвярнуўся ад Пісьменніка і закрыў вочы, каб нішто не замінала носу нырнуць глыбей у паветра і адхапіць мімалётную свабоду. Пошуку і стварэнню паху не хацелася замінаць, таму Пісьменнік пайшоў далей.

Я ўзяла яшчэ адно салодкае воблачка-маршмэлаў і прыляпіла на бірузовае неба. Акунула сонейка ў растопленае сметанковае масла — цёплае, мякка-жоўтае святло ахутала Горад. Пераставіла Пісьменніка бліжэй да Мастака. Праверыла, ці ёсць яшчэ фарбы ў бутэльках. Быццам усё.

На карціне жоўтыя плямы перацякалі ў нябеснае, крэмавае і белае. Ніякіх персанажаў не было. Толькі колеры. Сонечна-жоўты з левага кута карціны перацёк у сярэдзіну, у самае сэрца — і спыніўся. Нябесны дыяганальны штрых перайшоў у адценні крэмавага. У правым левым куце ляжаў белы. Вось і ўвесь твор. Мастак у такім захапленні стаяў перад карцінай, быццам напісаў першы і апошні шэдэўр...

Сяргей КАЛЕНДА

Ціхая вуліца

(Урывак)

Шануй бацьку свайго і маці сваю

Аўтар прапанаваў «Маладосці» апавяданне пра тое, як часам складана паразумецца ў сваёй сям'і, калі быт ператвараецца ў абсурднае існаванне, і «толькі вар'яцкае стаўленне да жыцця не дазволіць з'ехаць з глузду».

— Дай, Божа, мне сілы, каб лёгка палётаць па міры!

— А хто мне ўжо можа даць спакойна пабыць адной у сваім пакоі, блін?!

— Я ўсё чула, Марыя! Што за мацюкі!!!

— Ну мамааааааа, я не мацюкалася! Адчапіцеся ад мяне нарэшце!

Марыя ляснула дзвярыма свайго пакоя, а бацька пайшоў на кухню, зайшоў збоку ад жонкі, абняў яе за талію і праз яе руку схапіў тое, што яна старанна наразала — гэта была рознакаляровая пластыкавая кактэйльная саломка.

— М-м-м! Гэта як пераплыць Ла-Манш!

— Ага, скажы гэта Марыі, яна кажа, што гатую я кепска!

— Добра, што ты высокая такая, як вежа міру...

— От ты так заўсёды! Не каб праблему вырашыць, толькі зубы загаворваеш! — прамовіла жанчына, скінула з таліі руку мужа, павярнулася, адчыніла кухонную шафу, дастала пакунак мукі, высыпала яго на стол, наліла зверху піва з банкі, высыпала парэзаныя пластыкавыя кружочкі і пачала ўсё гэта раскачваць у цеста. — Сёння будзе макарона! І я спадзяюся, усе будуць есці нармальна!!! — апошнюю фразу маці пракрычала так, каб было чутна на другім паверсе, але ў пакоі дачкі толькі зрабілі музыку грамчэй.

— Марыя! Спускайся на вячэру! — маці пракрычала з кухні, наліваючы з каструлі ў талерку дзіўнае рэчыва: абвараныя кавалкі мукі з расплаўленымі пластыкавымі трубачкамі... Зверху яна вырашыла ўсё пасыпаць зямлёй з-пад кактуса, які стаяў пасярод кухоннага стала. — Марыя! Я паўтараць па сто разоў не буду! Хутчэй уніз!

— Як жа вы мяне дасталі!!! — закрычала Марыя, спускаючыся.

— Гэт ты мне тут ня тое! Ведаеш жа ж! Не адразу каб тут! Зараз вазьму мячык і пакажу табе астэроід!

Бацька схапіўся за рэмень, расшпіліў яго і выцягнуў са штаноў. У выніку атрымалася не вельмі, бо ў мужчыны з'ехалі долу штаны. Марыя засмяялася і пацягнулася па тэлефон, каб сфатаграфаваць бацьку ў смешным становішчы.

— Ах ты тваю направа! Пакладзі кран, інакш я не адказваю за пераезд!

Пакуль Марыя з бацькам гарлапанілі і бацька, заблытаўшыся ў нагавіцах, спрабаваў да дачкі дацягнуцца рэменем, маці ціхенька сабе памыла замест посуду хлебніцу і тостар, акуратна іх абцерла ручніком, а потым падышла са спіны да бацькі і з усёй моцы ўдарыла яго па галаве лабутэнам. Мужчына закрычаў не сваім голасам, у яго па лбе пацёк тонкі струмень крыві.

— Сядайце ўсе вячэраць! — прамовіла маці і пайшла на кухню.

Бацька яшчэ пакрычаў крыху, але хутка стаміўся і заглух.

— Лёня, пазвані сыну. Няхай ужо дадому едзе. Вячэра стыне, — прамовіла маці.

Лёня выцер рукавом скрываўлены лоб, узяў з тумбачкі мабільны тэлефон і набраў Віцю. Марыя села нарэшце за стол, але есці тое, што было ў талерцы, ёй зусім не хацелася.

— Мама, ну мамачка, слухай, не, я цябе шчыра прашу, згатуй што-небудзь нармальнае!

— Татку, можаш мне не званіць! Я ўжо дома! Галодны, як ваўкалак! — на парозе стаяў хлопец, трымаючы ў руках тэлефон.

— От мой харошы! — прамовіў бацька і пайшоў насустрач сыну.

— А што гэта ў цябе галава ў крыві?!

— А гэта нічога!

— Ну то добра!

— Давай за стол! — прамовіла маці і наваліла ў талерку сыну мучнога пластыку, пасыпанага зямлёй.

— Ох, смаката сёння якая! — абрадаваўся Віця.

Не паспелі ўсе як мае быць павячэраць, як раптоўны грукат у дзверы, а потым настойлівы званок выштурхнулі сям'ю з ідыліі.

— Адчыняйце! Гэта паліцыя!

Адчыняць дзверы не трэба было, Віця іх не зачыняў.

— Не варушыцца, усім пакласці рукі на стол, пакласці на стол, я сказаў!

Усе зрабілі так, як прасіў паліцэйскі, а Віця, на свой страх і рызыку, павольна ўстаў з-за стала.

— У нас усё добра... усё як мае быць... вы прыехалі да нас дарма, спадар паліцэйскі, — прамовіў сын, прыхапіўшы са стала батон. — Вось, трымайце, гэта мая дарагая матуленька сама выпякае. Цудоўны на смак! Вазьміце з сабой, я вас правяду да дзвярэй.

Паліцэйскі падпарадкаваўся падлетку, узяў батон і накіраваўся да выхаду.

— Добрага вам вечара, — прамовіў ён і хлопнуў дзвярыма.

Праехаўшы не адзін кіламетр, ён спыніўся. Уключыў аварыйныя агні, выключыў рацыю і закурыў.

Праз пару хвілін мужчына заўважыў пакладзены на суседняе крэсла батон. Узяў яго, пакруціў... Потым, павагаўшыся, адкусіў.

Не паспеў разжаваць кавалак, як на зубы трапілася вострае. Мужчына выплюнуў хлеб на далонь і заўважыў, што начынне батона складзена з цвікоў — маленькіх цвікоў для мэблі.

Спачатку паліцэйскі нават не здзівіўся, а толькі заўсмяхаўся. Ізноў адкусіў, разжаваў, прамовіў: «Гіпноз нейкі», завёў машыну, уключыў мігалкі, развярнуўся і пагнаў назад, на вуліцу Ціхую, 6.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
14 01 2021 г.

SEX-БАЛЯСЫ

ШЛЮБНЫЯ АФЕРЫ

На што гатовы чалавек дзеля афіцыйнага афармлення адносін з супрацьлеглым полам? У кожнага сваё стаўленне і памкненні ў гэтым пытанні. («Аб'ява: «Пазнаёмлюся з закончаным мярзотнікам з мэтай павышэння самаацэнкі».) Нехта гатовы доўга чакаць станоўчага адказу сваёй абранніцы. («Калі мне надакучыць добра жыць, я ажанюся і буду цярпець, як усе нармальныя людзі».) Хтосьці імкнецца стаць лепшым у вачах патэнцыйнага партнёра. («Каханне робіць чалавека чысцейшым. Ва ўсялякім выпадку, прымушае мыцца, галіцца і мяняць шкарпэткі...») Для некага вельмі важна зрабіць прапанову рукі і сэрца неяк запамінальна, крэатыўна. («Забаўляе, калі фарбаваная бландзінка з сіліконавымі грудзьмі імплантамі, ботаксам у вуснах, ліпасакцыяй «пятай кропкі», пластыкай твару, з нарошчаным вейкамі і пазногцямі марыць пра сапраўднае каханне».) Канешне, не ўсе бываюць шчырыя ў пагоні за дасягненнем мэты, у некага могуць праявіцца і не самыя лепшыя якасці. («Прыгледзела сабе мужа... Падкажыце, куды падзець яго жонку?»)

Але цынізм 29-гадовай англічанкі Тоні Стэндэн проста ўражвае! Каб сабраць грошы на вяселле, яна паведаміла сябрам і нават дала інтэрв'ю мясцовай газеце, што ў яе... невылечная хвароба і ёсць апошняе жаданне... («На першым спатканні я выражу нашы імёны на дрэве. Гэта самы рамантычны спосаб паведаміць табе, што ў мяне з сабой нож».) Натуральна, тым самым жаданнем было выйсці замуж, пакуль яна ў стане хадзіць, і каб яе да алтара павёў бацька, які, дарэчы, насамрэч быў хворы на рак і памёр незадоўга да вяселля... Сябры былі гэтак уражаны заявай Тоні, што сабралі ёй 8,5 тысячы фунтаў стэрлінгаў. І дзяўчына, нягледзячы на смерць блізкага чалавека, нічога не стала адмяняць... («Каця была настолькі гарачая дзяўчына, што «нагрэла» Анатоля на 50 тысяч».) Як казалі госці, на ўрачыстасці маці і брат маладой былі ў прыгнечаным стане, а вось сама нявеста весялілася напоўніцу... («Жаноцкасць — гэта ўменне жанчыны хаваць свайго ўнутранага дэсантніка».) Пасля новаспечаная жонка разам з 52-гадовым мужам паехалі ў атэль, а на наступны дзень ірванулі на мядовы месяц у Турцыю. («Жаночая логіка — гэта траўма для мужчынскай псіхікі».)

Вы думаеце, на гэтым усё скончылася? Калі ў пачатку года Тоні казала, што жыць ёй засталося два месяцы, дык пазней зноў пачала збіраць грошы, каб «пазмагацца» з «хваробай» і — пападарожнічаць. Так яна з мужам наведала Германію, Чэхію, Аўстрыю, Венгрыю і Італію... («— Уяўляеш, біёлагі даказалі, што тараканы могуць жыць і без галавы! — Могуць. Але ў галаве ім утульней».) Калі дзяўчына расказала сябрам, што паспела перахварэць і на каранавірус, тыя нарэшце пачалі падазраваць яе ў падмане і ў выніку выкрылі аферыстку і паведамілі пра гэта ў паліцыю. («— Наш дзядуля пяць разоў перапісваў завяшчанне. — Сам вінаваты. Не трэба было з настаўніцай мовы жаніцца».) Тоні прад'явілі абвінавачанне ў махлярстве і ёй пагражае рэальны турэмны тэрмін. А вось пра тое, ці ведаў яе абраннік пра ўвесь гэты падман, гісторыя маўчыць. («Паводле статыстыкі, самая папулярная мужчынская эсэмэска — «Я цябе таксама».)

Трэба сказаць, што падобныя гісторыі — не такая ўжо і рэдкасць. Напрыклад, мужчына з кітайскай правінцыі Гуйчжоў «ажаніўся» з актрысай, каб атрымаць ад гасцей грошы на бізнес. «Жаніх» проста зладзіў... фэйкавае вяселле. («— Ён падманам схіліў мяне да сексу. — Якім чынам? — Сказаў, што мне спадабаецца».) Будучы прадпрымальнік «арандаваў» на некалькі дзён актрысу, якая павінна была выканаць ролю нявесты перад яго сваякамі і сябрамі. «Жонка напракат» абышлася яму прыкладна ў 500 долараў. («Распусная інтэлігентная жанчына нашмат больш прыемная, чым проста інтэлігентная, і цікавейшая, чым проста распусная».) «Вясельная цырымонія» прынесла арганізатару 8,5 тысячы долараў, з якіх, дарэчы, ён так нічога і не заплаціў актрысе. («У рэстаране сядзіць пара. Павячэралі. Дзяўчына падзывае афіцыянта і пачынае даставаць грошы, каб разлічыцца. Хлопец кажа ёй: «Любая, я сам з ім разлічуся, давай сюды грошы».) Апошняя звярнулася да юрыстаў, але ўсё роўна нічога не атрымалася: яна не заключыла дагавор з аферыстам. («Дзяўчаты, калі марыце аб прынцы на белым кані, вы разумееце, што вам давядзецца карміць не толькі прынца, але і яго жывёліну?»)

А вось у наступнай гісторыі жорстка «развялі» ўжо мужчыну. Інданезіец Джозеф больш за год перапісваўся з «дзяўчынай» з Тайваня. Яны дзяліліся фатаграфіямі, марылі, і мужчына быў у захапленні ад сяброўкі. Яго засмучаў толькі адзін момант — яна ўпарта адмаўлялася паказваць твар, маўляў, веравызнанне не дазваляе. («— Чаму вы на мяне як на дурніцу гледзіце? — Я стараюся быць шчырым».) Хлопец працягваў адносіны і дасылаў «дзяўчыне» грошы. Аднойчы тая напісала, што бацькі знайшлі ёй іншага жаніха. Джозеф тут жа прапанаваў стаць яго жонкай і адправіў ёй сродкі для ўцёкаў. Падчас цырымоніі нявеста хавала твар за шчыльным вэлюмам. А пасля мужчына зазірнуў пад яго і абамлеў. На яго глядзела... старая «кракадзіліха». Хутка новаспечаны муж развёўся, а паважная дама вярнулася ў Тайвань. («Дзіўна, але з вяселлем і разводам віншуюць адны і тыя ж людзі і аднолькава шчыра».) Яна прызналася, што дасылала жаніху здымкі мадэлі.

Вось як яно часам бывае... («Ажаніцца зусім не цяжка, цяжка быць жанатым».)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Людзі думаюць, што ў маім жыцці не бывае суму...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А як ты выбіраеш кампазіцыі для сябе?

— Зараз стала актыўна супрацоўнічаць з замежнымі аўтарамі, асабліва ўкраінскімі. Кожны дзень на маю пошту прыходзіць шмат дэмак, аранжыровак і «сырых» нарыхтовак. Але з песняй, як з чалавекам, ты адчуваеш, тваё гэта ці не. Галоўнае — прачуць музыку ўсім сэрцам. Напрыклад, з песняй «Цюльпаны» адбыўся імгненны канект з першых нот. Я адразу палюбіла яе і сказала, што вельмі хачу выканаць гэтую кампазіцыю. А бываюць выпадкі, калі зрастаешся з песняй толькі ў працэсе работы. Ты бярэш сыры матэрыял, змяняеш тэкст, мелодыю, а потым пішаш новую аранжыроўку. У выніку песня можа атрымацца абсалютна іншай і адрозніваца ад першапачатковай дэмкі, але часцей за ўсё аўтарам вельмі падабаецца фінальны варыянт.

Я сама пішу вершы, але неяк не даходзіла да мелодый. А вось за час самаізаляцыі, калі менш хадзіла на работу і была з сям'ёй у вёсцы, пачала ствараць песні сама. Яны зусім не падобныя на мае папярэднія кампазіцыі. Вельмі хочацца набрацца смеласці іх выпусціць, таму што сваё паказваць заўсёды страшна.

— Хто цябе натхняе ў музыцы?

— Куміраў у мяне няма. Ёсць артысты, якія падабаюцца. І калі яны да нас прыязджаюць, то я спрабую ўсімі спосабамі ўзяць у іх інтэрв'ю ці проста паразмаўляць з імі за кулісамі. Адна з такіх апошніх сустрэч была з Цінай Караль. Мяне вельмі натхняе яе харызма, голас, паводзіны на сцэне і стаўленне да жыцця. Я была на яе канцэртах, дзе кожны раз чула жывы гук і выдатны вакал.

«Мне хочацца рухацца няхай маленькімі, але важнымі крокамі ў музыцы. Ёсць ідэя сабраць стадыён «Дынама» на сольным канцэрце».

— Пагаворым пра кліп «Побач з табой». Як узнікла ідэя, чаму абрала менавіта такую гісторыю?

— Для мяне гэта эксперымент ва ўсіх планах. Па выхадзе яна атрымалася не такой, якой я бачыла яе першапачаткова, але водгукі паказалі, што песня адразу ўсім спадабалася. Ведаеце, я раней не рабіла кампазіцый у такім стылі, які зараз папулярны, асабліва сярод хлопцаў. Тут чуецца нейкі дысананс глыбокай лірыкі і рухомага біта.

Адразу зразумела, што хачу кліп-гісторыю, але мне не хацелася рабіць нешта банальнае. Не буду спойлерыць, раскажу агульную ідэю кліпа. Мы хацелі паказаць, што сапраўднае каханне — без межаў, і што з чалавекам трэба быць побач як у шчаслівыя, так і ў складаныя моманты.

Я атрымала вельмі шмат водгукаў. У кліпа больш за 200 тысяч праглядаў, і для мяне гэта ўласны рэкорд. Падабаецца, што людзі каментуюць і прыгадваюць свае гісторыі. Была ідэя зрабіць нарэзку кадраў, якія ідуць у самым пачатку, каб проста перадаць атмасферу кахання, але чагосьці не хапала, і тады рэжысёр кліпа Васіль Ліхтаровіч прапанаваў такую кульмінацыю. Калі ён пра яе расказаў, у меня адразу беглі мурашкі па целе.

— Хацела б сябе паспрабаваць у нейкай новай сферы?

— Зусім не хачу ў кіно, таму што я хто заўгодна, але толькі не актрыса. Вось што люблю, дык гэта танцаваць. У дзяцінстве ведала: калі не стану спявачкай, мне будзе чым заняцца. Я нават зайздросціла танцорам, бо ім можна есці марожанае, а музыкантам нельга, каб зберагчы свой голас. У больш дарослым узросце хадзіла на сальсу, таксама прафесійна займалася танцамі жывата.

— Якія планы на будучыню як у спявачкі?

— Мне хочацца рухацца няхай маленькімі, але важнымі крокамі ў музыцы. Ёсць ідэя сабраць стадыён «Дынама» на сольным канцэрце.

Хачу паказаць сябе і сваю творчасць у іншых краінах, трошачкі часцей з'яўляцца на замежных пляцоўках.

— Якую параду дала б маладым чытачам?

— Мне падаецца, што кожны дзень трэба выкарыстоўваць, як шанц стаць крышачку лепшым. Трэба нешта браць з кожнага дня, бо няма нічога выпадковага. У нас ёсць магчымасць ствараць, займацца тым, што нам падабаецца, абдымаць блізкіх людзей і рабіць нешта для сябе. Шануйце і па-сапраўднаму любіце сваё жыццё, толькі тады ўсё ў вас атрымаецца.

У мяне часта пытаюцца, чаму я заўседы на пазітыве. Людзі думаюць, што ў маім жыцці не бывае сумных момантаў, але яны ёсць. Толькі навошта іншым бачыць Анжаліку Пушнову ў такім стане? Часам мы не можам змяніць абставіны, але можам змяніць стаўленне да іх. Добрае ёсць заўсёды.

— Калі б у цябе была магчымасць вярнуцца ў дзяцінства і сустрэцца з сабой маленькай, што б ты сказала або параіла той дзяўчынцы? І ці спраўдзіліся ўсе яе мары?

— Я сказала б сабе: ты ідзеш правільнай дарогай. Будзь смялейшай і аддавай больш любові блізкім, таму што часам ты растрачваешся і забываеш, што гэтыя людзі дапамаглі табе стаць лепшай.

Яшчэ параіла б ніколі не спыняцца. Аднойчы тата ў патрэбны час даў мне вельмі добрую параду: калі ў якой-небудзь са сфер усё дрэнна, не давай гэтаму разбурыць другую частку цябе. Проста ў мяне быў момант, калі нічога не хацелася рабіць, была абсалютная апатыя да ўсяго. І тады ж нарадзілася песня True Love да «Еўрабачання», была мая заяўка і ўдзел у фінале. Прыгадваю гэты перыяд жыцця з цеплынёй, таму што фраза таты дапамагла мне падняцца і ісці далей.

Пакуль яшчэ рэалізавала не ўсе мары, але я ў працэсе. Большасць з іх увасобіліся ў рэальнасць, і гэта вялікае шчасце. Ёсць нават моманты, прыгадваючы якія, ганаруся сабой, а бывае, калі не вельмі. Але ўсё роўна мары спраўджваюцца, галоўнае — верыць і ісці да іх.

Рэвека АХРАМЕНКА,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі БДУ.
Фота дадзена гераіняй.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 13.01.2021 г.

ВАШ РЭСУРС ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ

Спосабы выкарыстання ёлкі пасля зімовых свят

І добрае, і дрэннае мае ўласцівасць заканчвацца. Вось і навагоднія святы, якіх мы так чакалі, засталіся ў мінулым. Апошняе прывітанне — Стары Новы год — і ўсё, бывай, ёлка, да наступнага снежня... Але проста выкінуць дрэўца — гэта сумна, да таго ж, неэканомна і не «эка-фрэндлі» — навошта засмечваць навакольнае асяроддзе? Тым больш што ёлачка нам яшчэ спатрэбіцца.

КАЛІ ЁЛКА САПРАЎДНАЯ...

Знайсці прымяненне сапраўднаму ялічнаму дрэўцу прасцей, чым штучнаму. У першую чаргу гэта датычыцца яловых іголак. Шкада выносіць на сметнік такі каштоўны рэсурс: хвоя вылучае араматычныя лятучыя рэчывы, дэзінфікуючы паветра. Апошнія забіваюць мікробы і ўмацоўваюць нашу дыхальную і нервовую сістэму.

Можна, напрыклад, стварыць уласнае аўтарскае **ялічнае мыла ручной работы.** Мылаварэнне — моднае хобі многіх крэатыўшчыкаў, а калі вы будзеце рабіць дамашняе ялічнае мыла разам з дзіцем, гэты занятак ператворыцца ў цудоўны развіццёвы ўрок. Бонус — экалагічна чысты касметычны хэндмейд-прадукт з эфектам скрабу. Рэцэптаў хвойнага мыла ў інтэрнэце мноства. Прасцей за ўсё — стварыць уласнае мыла на аснове белага неараматызаванага дзіцячага.

Іголачкі здымаем з галінак (калі ёлка прастаяла ў вас некалькі тыдняў, ігліца будзе асыпацца без усялякіх намаганняў з вашага боку), прамываем і заліваем кіпенем хвілін на 7-10. Калі ігліца стане мяккая, яе трэба здрабніць — напрыклад, дробна парэзаць нажом. Дзіцячае мыла націраем на тарцы і разаграваем на вадзяной лазні, дадаўшы ў пластычную масу трохі вады (у прынцыпе, замест дзіцячага мыла можна проста купіць у краме для рукадзелля спецыяльную мыльную аснову). І пачынаем тварыць. Дадаём у наш будучы касметычны прадукт ігліцу, апельсінавы эфірны алей, карыцу, мёд — з чым яшчэ ў вас асацыюецца зімовая ўтульнасць? Прапорцыі — 1 ч. л. ігліцы на 100 г асновы. Можна выкарыстоўваць зялёны харчовы фарбавальнік і спецыяльныя формачкі, можна абысціся без усяго гэтага, разліўшы наша мыла для застывання ў слоічкі з-пад ёгурта. Пакідаем усё гэта на 30 хвілін — і хэндмейд-касметыка гатовая: створаная на аснове яловай ігліцы, яна ўтрымлівае эфірныя рэчывы, а значыць, валодае рэлаксуючым эфектам, здольная сунімаць мігрэнь і з'яўляецца прафілактыкай прастуды.

Калі вы адчулі прыліў натхнення, можна частку мыльнай асновы пакінуць белай, а частку пафарбаваць. І зрабіць мыла паласатым, заліўшы яго ў форму пластамі або пры дапамозе драўлянай шпажкі намаляваўшы прыгожыя разводы.

Вы спытаеце, навошта ствараць сабе клопат, калі ў крамах вялізны выбар мыйных сродкаў на любы густ і кашалёк? Справа тут не ў неабходнасці чымсьці намыліцца. Справа — у хюге. Слова гэта скандынаўскае (хоць даўно ўжо стала міжнародным) і прамога перакладу на рускую ці беларускую мовы не мае. Яно азначае абсалют хатняй утульнасці, адчуванне абароненасці і яднання са сваімі роднымі. Стварыць такую атмасферу ў сваім доме пры дапамозе пакупных рэчаў досыць складана. Тут трэба тое, што зроблена з любоўю сваімі рукамі. Вазачкі, шторкі, тое ж мыла ручной работы, іншы хэндмейд. Не ад беднасці, а ад жадання карыстацца рэчамі, якія захоўваюць цяпло вашых рук і рук вашых любімых.

Дарэчы, здробненую ігліцу можна і не замешваць у мыла, а выкарыстоўваць для падрыхтоўкі **ялічных ваннаў прыгажосці.** Заліваем ігліцу кіпенем, настойваем паўгадзіны, працэджваем. Выліваем у ванну. Яловыя іголкі багатыя на вітамін С, а таксама А і вітаміны групы В. Як вынік — прыгожая скура і бліскучыя здаровыя валасы. Працягваючы гігіенічную тэму, заўважым, што некаторыя заўсёднікі паравой лазні любяць яловыя венікі. Праўда, калючыя яловыя галінкі трэба доўга размочваць у кіпені. Ну і наогул такі венік — на аматара.

Працягваючы тэму хатняй утульнасці, ялічныя галінкі можна пакласці ў шклянку, заліць асновай для вырабу свечак (таксама прадаецца ў рукадзельных крамах) і стварыць прыгожыя зімовыя свечкі. Можна змясціць ігліцу ў палатняныя мяшэчкі і зрабіць араматычныя сашэ (іх кладуць у шафу, дзе захоўваецца чыстая пасцельная бялізна).

А калі вы — заўзяты агароднік-садавод, то захавайце ігліцу да вясны: гэта выдатная **мульча** для пасадак. Утрымлівае вільгаць у глебе, адпужвае насякомых-шкоднікаў і выдатна спраўляецца з грыбковымі захворваннямі культурных раслін. Дарэчы, яловыя іголкі паніжаюць pH глебы і дапамагаюць росту культур, якія любяць кіслую зямлю (рададэндроны, садовыя чарніцы). А яшчэ ігліца — дзейсны сродак барацьбы са шкоднікамі бульбы, у прыватнасці, з драцянікам. Увесну, саджаючы бульбу, змясціце ў кожную лунку жменю ігліцы, і гэта забяспечыць выдатны ўраджай.

Але ж, акрамя ігліцы, у ёлкі ёсць яшчэ галіны і ствол. Што рабіць з імі? Тое, што «на паверхні» — **«тачылка» для ката.** Кошкам падабаецца смалісты, «прыродны» хвойны пах — нездарма ж яны кожны Новы год імкнуцца паваліць ёлку! Ачысціце ствол ёлкі ад калючых сучкоў і кары, умацуйце на ўстойлівай падстаўцы, шчыльна абматайце, напрыклад, бялізнавай вяроўкай. А верхавіну ўпрыгожце старым пампонам — няхай боўтаецца на вяровачцы: кот будзе задаволены.

Яшчэ адзін варыянт — распілаваць ствол на аднолькавыя па таўшчыні кружочкі, пакрыць іх лакам, склеіць клеявым пісталетам і зрабіць **падстаўкі пад гарачае** для кухні. Папярэдне драўляныя пласціны варта адшліфаваць і можна апрацаваць антысептыкам. Для дэкору выкарыстоўваюць не толькі лак, але і іншыя віды пакрыццяў. Напрыклад, фарбу.

Хочаце больш складаную творчую задачу — стварыце пано. Або драўляную **шторку для ванны** (ці для іншых памяшканняў) — глядзіцца хораша плюс бадзёры ігліцны водар. Распілоўваем дрэва на кружочкі аднолькавай таўшчыні, пакрываем лакам, у кожным свідруем адтуліну і нанізваем на леску або ланцужок.

КАЛІ ЯНА Ў ВАЗОНЕ...

Навагодняя ёлачка ў кветкавым гаршку даўно перастала быць экзотыкай: з аднаго боку, не трэба высякаць жывое дрэўца, з другога — падманваць сябе, што штучная елка здольная стварыць навагоднюю атмасферу не горш за сапраўдную лясную прыгажуню. Наогул, ніякія хвойныя не прызначаныя для дамашняга вырошчвання. І елка — не выключэнне. Таму важна як мага хутчэй **перасадзіць яе ў адкрыты грунт.** А да гэтага трэба правільна пасяліць елку — загараднага жылля — яшчэ да перасадкі ў адкрыты грунт прыкапаць ялінку непасрэдна з вазонам у снег пад адкрытым небам (у зацененым месцы). І працягваць прыглядаць за ёй, пакуль не адтае глеба.

КАЛІ ЁЛКА ШТУЧНАЯ...

Утылізацыя штучных ёлак — сур'езнае пытанне ў многіх краінах. Справа ў тым, што яе іголкі робяцца з поліэстэру, і перапрацоўцы такія «дрэвы» не падлягаюць. Між тым, яны ёсць амаль у кожным доме і, зразумела, прыходзяць у непрыдатнасць. Што рабіць са штучнай елкай?

Адзіны варыянт — хэндмэйд-вырабы. Але паколькі матэрыял зусім не прыродны, то і прасторы для крэатыву тут няма. Драўніна сама па сабе валодае прыгожай тэкстурай, ігліца пахне лесам, а канструкцыя з жалезак і прадуктаў нафтаперапрацоўкі мае прэзентабельны выгляд, мабыць, толькі адразу пасля пакупкі. Тэарэтычна з яе галінак можна зрабіць нейкія ненавагоднія элементы дэкору для дому і саду, але каб яны добра выглядалі, патрэбны, напэўна, прафесійныя навыкі дызайнера. Калі месца дазваляе, можна захаваць штучную елку, што прыйшла ў непрыдатнасць, каб праз год выкарыстаць яе для навагодніх элементаў аздаблення дому. Або зрабіць штучныя яловыя лапкі **асновай велікоднага вянка.** Вешаць на дзверы велікодны вянок — заходнееўрапейская традыцыя (як і вянок калядны). Гэта адзін з сімвалаў Вялікадня, сэнс якога — вечнае жыццё. Наогул велікодны вянок робяць з галінак ліставых раслін, натуральных або штучных. Але і са штучнымі яловымі лапкамі можна паспрабаваць пакрэатывіць. Калі дадаць у вянок сімвалы Вялікадня — яйкі, кветкі і лісце, гэта прыглушыць навагодні сімвалізм, што традыцыйна замацаваўся за ігліцай.

у самае халоднае месца. У чалавечым жыллі елцы горача, душна і занадта суха. Лепш за ўсё яна будзе адчуваць сябе на зашклёным балконе, пад аховай ад прамых сонечных прамянёў. Вельмі важна падтрымліваць вільготнасць: апырскваць елку з пульверызатара, паставіць побач ёмістасць з вадой. Паліваць расліну лепш раз у тыдзень, занесці ў дом — толькі на пару навагодніх дзён і не ставіць паблізу ад батарэй. Вырашыўшы, што прыйшла вясна, елка пойдзе ў рост, і карані аслабнуць у цесным вазоне. Перасаджваць елку ў адкрыты грунт (на прысядзібным участку або ў лесе) трэба, як толькі сыдзе снег. На жаль, ялічныя расліны дрэнна пераносяць перасадку: выжывальнасць складае прыкладна 50 %. Гэта звязана з тым, што нават пры лёгкім пашкоджанні каранёвай сістэмы ялічныя гінуць, таму перасаджваць іх можна толькі з камяком зямлі, каб не пашкодзіць карані. Але ўсё ж лепш рызыкнуць, чым пакідаць елку ў доме. У пакаёвых умовах ялічным патрабуецца апырсканне тройчы ў дзень (што вельмі нязручна для гаспадара!), інакш пачнецца апад ігліцы. Аптымальны варыянт для

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАГОТОВКИ И (ИЛИ) ЗАКУПКИ ВИНОГРАДНОЙ УЛИТКИ

Территория, на которой предоставляется право на заготовку и (или) закупку	Предмет аукциона	Условия заготовки и (или) закупки	Цена предмета торгов, BYN	Сумма задатка, BYN
Мядельский район	Право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки сроком на 5 лет в объемах более 10 000 кг	Предельно допустимый объем изъятия виноградной улитки – 60 684 кг в календарном году	1450	290

1. **Аукцион состоится 18 февраля 2021 года в 11 часов в здании Мядельского райисполкома по адресу: г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 20.**

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Участнику необходимо подать соответствующее заявление в Мядельский райисполком и заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет BY81AKBB36006230019090000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк» AKBBBY2X, получатель – Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, УНП 600537220, код платежа 05520.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 08.00 до 17.00 по адресу: г. Мядель, пл. Ленина 1, каб. 21, последний день приема документов **15 февраля 2021 года.** Заключительная регистрация участников **18 февраля 2021 года с 10.00 до 10.50.**

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

